ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 18 (5024) 3 мая 2019 г.

ISSN 0024-4686

*Балючая памяць: праз пакаленні* стар. 4—5

*На мяжы рэальнасці і ўяўлення* стар. 7

*Творчыя часы Наталлі Гайды* стар. 13

16+

# Дыялог часоў. Дыялог у часе

Сабрацца, каб разважаць пра тое, як і чым жывём, як распараджаемся жыццём: ці не здраджваем яму і тым, хто захаваў яго для нас, ці не марнуем час, ці небыякавыя да чалавека і таго, што яго хвалюе цяпер? Да чалавека, якога ў ліхія часы трэба абараняць са зброяй (каб быў працяг нашага існавання), які і ў наш час варты асаблівай абароны — мірнай, з неабыякавай увагай да яго клопатаў.

Працяг тэмы на стар. 2 ►




Фота Кастуся Дробава.



Фота Кастуся Дробава.

*Мінулае і сучаснасць у дыялогу спалучыліся пад дахам павільёна БелЭкспа, дзе праходзіць XXIII Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «СМІ ў Беларусі».*



Фота Кастуся Дробава.

ISSN 0024-4686

## акцэнты тыдня

**Віншаванне.** Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў суайчыннікаў са Святам працы. «У Беларусі адзначаюць гэты дзень з асаблівым натхненнем, адрасуючы словы павагі кожнаму працаўніку і працоўнаму калектыву, выказваючы глыбокую ўдзячнасць ветэранам працы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт перакананы, што менавіта працавітасць, вернасць традыцыям і любоў да Радзімы з'яўляюцца залогам далейшага развіцця і працвітання Беларусі.

**Вялікдзень.** Кіраўнік дзяржавы ў свята Вялікадня запаліў свечку ў храме Раства Хрыстовага ў аграгарадку Астрошыцы Лагойскага раёна. Кіраўнік дзяржавы пажадаў прыхаджанам здароўя, радасці, добрага настрою і ўсяго найлепшага ўсім беларусам. У дар храму Аляксандр Лукашэнка перадаў абраз «Уваскрэсенне Гасподняе», напісаны ў майстэрні Віктара Доўнара па старажытнай візантыйскай тэхналогіі, а прыхаджан пачаставаў шакаладам «Прэзідэнт», які выпрабляецца па спецыяльнай рэцэптуры.

**Юбілеі.** Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народную артыстку Беларусі Наталлю Гайду з юбілеем. «Ваш уклад у стварэнне, захаванне і развіццё традыцый нацыянальнай тэатральнай школы з'яўляецца прыкладам для маладых артыстаў, узорам шчырага служэння нашай краіне. З вашым імем звязаны найлепшыя дасягненні Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў народную артыстку Беларусі Ядвігу Паплаўскую з юбілеем і адзначыў: «Дзякуючы выключнаму таленту і працаздольнасці вы сталі ўзорам высокага прафесійнага майстэрства, узорам адданага і нястомнага служэння нацыянальнаму мастацтву». Прэзідэнт падкрэсліў, што шматгадовая плённая творчая дзейнасць артысткі — яркая старонка ў гісторыі беларускай эстрады.

**Страта.** Прэзідэнт Беларусі накіраваў спачуванне родным і блізкім народнай артысткі СССР Эліны Быстрыцкай. «Эліна Аўраамаўна, якая валодала ўнікальным талентам і тонкім успрыманнем характараў персанажаў, стварыла на экране і ў тэатры мноства запамінальных роляў, дзякуючы якім здабыла ўсенародную любоў», — гаворыцца ў спачуванні. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што творчая спадчына артысткі стала неад'емнай часткай скарбніцы савецкага і расійскага мастацтва. «Светлая памяць пра гэтага цудоўнага чалавека назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Нацыянальнае.** У выдавецтве «Беларусь» падрыхтаваны да друку альбом-каталог «Янка Купала. Я адплацію народу, чым моц мая магла», які прэзентуе мастацкія творы з калекцыі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, што ствараліся мастакамі на працягу амаль стагоддзя. Выпуск выдання ажыццяўляецца па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Альбом-каталог знаёміць з нацыянальнай школай выяўленчага мастацтва з 20-х гадоў мінулага стагоддзя да сучаснасці. Змешчаны звесткі з біяграфіі народнага песняра Беларусі, з гісторыі напісання некаторых твораў.

**Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ**

## актуальна

# Вандроўка па медыяпрасторы



Фота Кастуся Дробава.

Больш як 50 экспанентаў і 500 удзельнікаў — гэтымі днямі на праспекце Пераможцаў, 14 ёсць магчымасць чарговы раз уліцца ў айчынную і замежную медыяпрастору на XXIII Міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы «СМІ ў Беларусі». Каля паўтысячы сродкаў масавай інфармацыі Беларусі, Расіі, КНР, Балгарыі, Літвы, Азербайджана, Украіны, Латвіі, Індыі, Германіі, Турцыі, Грузіі і іншых краін размясціліся на агульнай плошчы выставачнай пляцоўкі — каля 1 тыс. кв.м.

Наведвальнікам выстаўкі прапанавана змястоўная праграма, якая складаецца з прэзентацый інфармацыйных і інтэрнэт-праектаў, аўтограф-сесій і майстар-класаў. Кіраўнікі СМІ і журналісты, а таксама прадстаўнікі экспертнай супольнасці на працягу гэтых трох дзён абмяркуюць важныя пытанні функцыянавання медыясферы, ролі сродкаў масавай інфармацыі ў развіцці грамадства і дзяржавы. Чатыры тэмы сёлета галоўныя на выставачным комплексе «БелЭкспа»: 75-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, унікальнасць малой радзімы, інтэрнэт-тэхналогіі і II Еўрапейскія гульні.

Традыцыйна шырока прадстаўленыя друкаваныя і электронныя СМІ, а таксама сеткавыя выданні, якія пачалі рэгістравацца ў Беларусі, згодна з новаўвядзеннем у заканадаўства, з 1 снежня 2018 года. Напрыклад, прэзентаваныя *MogilevNews.by*, сеткавае выданне інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведомости», *Ng-press.by*, заснаваны рэдакцыяй «Настаўніцкая газета», *Mediana.by*, рэдакцыяй якога выступае «Дом прэсы». Як і заўсёды, шмат увагі — рэгіянальным сродкам масавай інфармацыі, якія красамоўна могуць расказаць пра ўдзел у сацыяльна-эканамічным развіцці сваіх рэгіёнаў. Не застаюцца ўбаку і спартыўныя выданні, якія прадстаўляюць падчас выстаўкі свае творчыя праекты, што набывае асаблівае значэнне напярэдадні II Еўрапейскіх гульняў. Вялікае месца займаюць праекты БелТА, прэс-службаў і камунікацыйных агенцтваў. Дарэчы, выстаўка звязана і з іншымі медыямерапрыемствамі. У гэтым месяцы ў Салігорску і Слуцку пройдзе рэспубліканскі семінар, прысвечаны рэгіянальным СМІ, а ў другой палове мая будзе арганізаваны чарговы міжнародны медыяфорум.

Вялікую ролю ў развіцці выстаўкі штогод іграе цікавасць да яе замежных гасцей. На выстаўцы «СМІ ў Беларусі» можна даведацца пра развіццё журналістыкі ў іншых краінах дзякуючы шматлікім стэндам і ўдзелу дэлегацый. Ёсць нават асобны стэнд, які Міністэрства інфармацыі Беларусі падрыхтавала сумесна з Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей, які называецца «СМІ дыяспар». Краіны, што прадстаўлены на ім, — Украіна, Расія, а таксама нашы Балтыйскія суседзі.

Упершыню падчас выстаўкі «СМІ ў Беларусі» праходзіць Дзень піяру. Ініцыятыву, якую прапанавалі вядучыя камунікацыйныя агенцтвы краіны, падтрымала Міністэрства інфармацыі. Тэма выкарыстання PR-тэхналогій як дадатковага канала стасункаў з шырокай аўдыторыяй, у тым ліку праз СМІ, і ёсць лейтматыў Дня піяру. Далучыцца да праекта прапанавана шырокаму колу зацікаўленых, у тым ліку PR-спецыялістам, журналістам, прэс-службам дзяржаўных арганізацый і камерцыйных прадпрыемстваў з усіх рэгіёнаў. Да ўвагі ўдзельнікаў — насычаная праграма канферэнцый, майстар-класаў, прэзентацый тэарэтычных і практычных напрацовак, прафесійных дыскусій за круглым сталом, а таксама крэатыўныя мерапрыемствы ад студэнтаў і выкладчыкаў факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Акрамя таго, падчас свята знайшоўся час і для цырымоній ўзнагароджання пераможцаў і лаўрэатаў Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая Літара», Рэспубліканскага конкурсу сярод журналістаў і сродкаў масавай інфармацыі на лепшае асвятленне пытанняў міжнацыянальных і міжканфесіянальных адносін, міжкультурнага дыялогу ў Беларусі і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

**Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:**

***10 мая*** *— на сустрэчу з Алай Чорнай у СШ № 19 (13.30).*

***10 мая*** *— у літаратурную гасцёўню «Верасок» пры дзіцячай бібліятэцы № 16 (14.00).*

***10 мая*** *— на прэзентацыю кнігі Кацярыны Роўды «Паэтычныя карункі» ў бібліятэку юрыдычнага факультэта БДУ (пакой 109) (15.00).*

***13 мая*** *— на сустрэчу з Тамарай Залескай у СШ № 165 (13.00).*

***13 мая*** *— на імпрэзу з удзелам Міхася Пазнякова ў літаратурны клуб «Творчыя сустрэчы» пры бібліятэцы № 8 імя М. Багдановіча (14.00).*

***14 мая*** *— на сустрэчу з Леанідам Багдановічам у межах «Беларуская чацвярга» ў дзіцячую бібліятэку № 15 (13.00).*

***14 мая*** *— у літаратурны клуб «Слова» пры бібліятэцы № 3 (14.00).*

***14 мая*** *— на сустрэчу з Анатолем Матвіенкам у літаратурную гасцёўню Мінскага гарадскога адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Лідар» (г. п. Ждановічы) (15.00).*

***14 мая*** *— на літаратурную імпрэзу «Беларусь памятае» ў бібліятэку № 21 (14.30).*

***14 мая*** *— на ўрачыстае падвядзенне вынікаў гарадскога конкурсу чытальнікаў паэзіі і прозы з удзелам паэтаў і бардаў у Мінскі гарадскі тэатр паэзіі пры Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Я. Купалы (16.00).*

***14 мая*** *— на вечар Анастасіі Кузьміловай у літаратурны клуб «Шчырасць» пры бібліятэцы № 22 (16.00).*

***14 мая*** *— на літаратурны вечар «Нам сорак першы не забыць» з удзелам пісьменнікаў у паэтычны клуб «Парнас» пры публічнай бібліятэцы № 5 (18.00).*

***15 мая*** *— у студыю юных літаратараў «Шабаноўскія званочкі» пры дзіцячай бібліятэцы № 3 (11.00).*

***16 мая*** *— у Школу юнага паэта пры гарадскім аддзяленні СПБ (14.00).*

**Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:**

***14 мая*** *— на сустрэчу Марыі Ляшук з пагранічнікамі заставы «Сварынь» Драгічынскага раёна (14.00).*

***17 мая*** *— на адкрыццё VIII Міжнароднага фестывалю рускай паэзіі ў Рэспубліцы Беларусь «Сугучча слоў жывых» у Брэсцкую цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А. С. Пушкіна (14.00).*

***17 мая*** *— на падвядзенне вынікаў конкурсу маладых паэтаў «Мы народжаны для натхнення» ў межах свята «Сугучча слоў жывых» у Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр (18.00).*

***18 мая*** *— на сустрэчы ўдзельнікаў фэсту «Сугучча слоў жывых» з моладдзю ў ліцэй імя А. С. Пушкіна, абласны ліцэй імя П. М. Машэрава, Брэсцкі дзяржтэхуніверсітэт імя А. С. Пушкіна (11.30).*

**Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:**

***6 мая*** *— на сустрэчу з Аленай Фядзяевай у Віцебскі лячэбна-працоўны прафілакторый № 9 (18.00).*

***7 мая*** *— на сустрэчу з Валерыем Марчанкам з нагоды 75-годдзя Вялікай Перамогі ў Віцебскі дзяржаўны палітэхнічны каледж (16.00)*

***14 мая*** *— на сутрэчу з Пятром Буганавым «Словам і зброяй» з нагоды 75-годдзя Вялікай Перамогі ў СШ № 6 г. Полацка (13.00).*

***17—18 мая*** *— на выступленне Ірыны Радзіхоўскай у межах VIII Міжнароднага фестывалю рускай паэзіі «Сугучча слоў жывых» у г. Брэсце (12.00).*

**Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:**

***9 мая*** *— на літаратурнае свята «Пад мірным небам Беларусі», прысвечанае Дню Перамогі, з удзелам пісьменнікаў Гродзеншчыны на адкрытую пляцоўку каля Гродзенскага тэатра лялек (11.00).*

***16 мая*** *— на чарговыя заняткі з удзелам Пятра Сямінскага ў Гродзенскай гарадской літаратурнай школе на тэму «Літаратурны экспромт як разнавіднасць творчай імправізацыі» ў офіс аддзялення (17.00).*

**Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:**

***З 6 па 12 мая*** *— на адкрыты мікрафон «Чытаем радкі ў гонар Перамогі» ў межах тыдня памяці «Хай памяць пра іх ніколі не згасне» ў Магілёўскую абласную бібліятэку імя У. І. Леніна.*

***14 мая*** *— на вечар-сустрэчу «Вайна ўвайшла ў юнацтва маё» з Нінай Кандрацэнкай і пісьменнікамі аддзялення ў Магілёўскую бібліятэку імя У. І. Леніна (14.00).*

***16 мая*** *— на літаратурна-музычную кампазіцыю «У варце пачэснай іх унукі стаяць...» з удзелам пісьменнікаў аддзялення ў інтэрнат № 4 Белсельгасакадэміі (19.00).*

***17 мая*** *— на літаратурна-патрыятычную гадзіну «Не гасне летапіс Перамогі» ў межах раённай патрыятычнай акцыі «Героям лепшая ўзнагарода, што ў кнігах памяць пра іх ёсць» з удзелам Міколы Леўчанкі ў Варанінаўскую базавую школу Быхаўскага раёна (13.00).*

акцыя

# Лідскі замак чакае больш турыстаў

## Абрана культурная сталіца ў 2020-м

Калегія Міністэрства культуры, дзе разглядалася пытанне рэспубліканскай акцыі «Культурная сталіца года» на 2020 год, аддала перавагу Лідзе. Гэта другі па велічыні горад у Гродзенскай вобласці, культурны і прамысловы цэнтр. У многіх Ліда асацыюецца з выдатным помнікам абарончага дойлідства XIV стагоддзя, сваім гістарычным цэнтрам — Лідскім замкам.

Акцыя ладзіцца з 2010 года. У кожнай абвешчанай сталіцы адбываецца прэзентацыі яе культурнай самабытнасці, рэалізоўваюцца праекты развіцця і папулярызацыі традыцый, дасягненняў нацыянальнай культуры, актывізацыі творчай ініцыятывы. Галоўная мэта — распавесці жыхарам краіны пра лепшыя дасягненні на культурнай ніве, прывабіць у рэгіёны айчынных і замежных турыстаў, прыцягнуць увагу да горада. Дый самім гараджанам даць нагоду ганарыцца сваім, родным.

Так, у Лідзе ў 2020 годзе плануецца рэалізаваць шматлікія праекты, сярод якіх музейна-асветніцкі — «Замак Гедыміна — сведка мінуўшчыны», маладзёжны фестываль андэграўнднага мастацтва «Нетыповы PARADIS», адкрыты фестываль-конкурс мастацкай творчасці «Арт-тэрыторыя», абласны фестываль маладзёжных субкультур «Маладзевая хваля» і некаторыя іншыя.

Сёлета носьбітам ганаровага статусу з'яўляецца горад Пінск, летась быў Наваполацк. Першай культурнай сталіцай Беларусі стаў горад, які сярод беларускіх гарадоў згадваецца ў летапісе адным з першых — Полацк. У іншыя гады культурнымі сталіцамі паспелі пабыць Бабруйск, Маладзечна, Брэст, Гомель, Гродна, Магілёў і Нясвіж.

**Яна БУДОВІЧ**

супрацоўніцтва

# Натхнення край

## Гісторыя беларускай культуры адкрываецца для армян

Выстаўка «Беларусь — натхнення край», арганізаваная Нацыянальным гістарычным музеем у рамках Дзён культуры Беларусі ў Арменіі, пройдзе ў ерэванскім Музеі народнага мастацтва.

У экспазіцыйнай прасторы будуць прадстаўлены творы, якія адлюстроўваюць цесную сувязь традыцыйнай культуры Беларусі і сучаснага беларускага мастацтва. Пераемнасць глыбінных традыцый у сучаснай мастацкай творчасці ілюструюць копіі гравюр знакамітага кампазітара і мастака Напалеона Орды са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Мастацкая спадчына Орды — своеасаблівая ілюстраваная энцыклапедыя матэрыяльнай культуры XIX стагоддзя, якая з'яўляецца каштоўнай крыніцай па гісторыі архітэктуры. Малюнкі і літаграфіі Орды дапамагаюць уявіць, як выглядалі многія архітэктурныя помнікі, якія былі разбураныя або непазнавальна змяніліся. Жыццё і творчасць Напалеона Орды, шматграннасць яго талентаў, неабыякавасць да лёсу роднага краю — своеасаблівае сведчанне, як развівалася нацыянальная культура Беларусі ў пэўны гістарычны перыяд. У экспазіцыі выстаўкі «Беларусь — натхнення край» прадстаўлены вынікі творчых пошукаў сучасных майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

выстаўка

# Натхнёныя Жыровіцкай Божай Маці

## Абразы, выкананыя цалкам з прыроднага каменю, прадстаўленыя ў Мінску

**Пабачыць іх можна ў Лошыцкай сядзібе. Усе экспанаты зробленыя з італьянскага мармуру, оніксу, травертыну і г. д.**

Арганізатары сцвярджаюць, што выстаўка заяўляецца да публічнага прагляду ўпершыню, не мае аналагаў у праваслаўным свеце ні па аб'ёме выставачных матэрыялаў, ні па прадстаўленых тэхніках іх выканання ў каменеапрацоўцы, і таму яе можна назваць унікальнай. На выстаўцы пастаянна дэманструюць не менш чым 150 работ, з іх больш за палову рарытэтныя. Убачыць нетрадыцыйную трактоўку ў інтэрпрэтацыі малюнкаў біблейскіх вобразаў паспрыяе сам матэрыял — прыродны камень.

Экспазіцыя праводзіцца напярэдадні падрыхтоўкі да пашыранай выстаўкі ў адпаведнасці з блаславеннем Мітрапаліта Паўла Мінскага і Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, з нагоды ўрачыстых мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею 550-годдзя з'яўлення Жыровіцкай іконы Божай Маці.

**Дзмітрый СУГАНЯЕЎ**



Фота Анатоля Клешчука.

ЛіМ КАЛЯНДАР

**5 мая** — 200 гадоў з дня нараджэння Станіслава Манюшкі (1819—1872), польскага і беларускага кампазітара, дырыжора, педагога.

**5 мая** 85 гадоў адзначае Мікалай Казакевіч, мастак.

**5 мая** — 75 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Дзянісава (1944—2012), заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь.

**5 мая** 75-гадовы юбілей святкуе Дзмітрый Сарока, мастак.

**6 мая** — 115 гадоў з дня нараджэння Паўлюка (Паўла) Труса (1904—1929), паэта.

**6 мая** — 110 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Коха (1909—1972), мастака.

**7 мая** — 100 гадоў з дня нараджэння Георгія Шчарбатава (1919—1957), празаіка, крытыка.

**7 мая** 60 гадоў спаўняецца Святлане Статкоўскай, майстру дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва.

**8 мая** — 100 гадоў з дня нараджэння Мікалая Пушкара (1919—1993), мастака-кераміста, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

**8 мая** — 85 гадоў з дня нараджэння Міколы (Мікалая) Ганчарова (1934—1991), графіка, мастацтвазнаўца, пісьменніка.

**9 мая** — 95 гадоў з дня нараджэння Аляксея Груцы (1924—2017), мовазнаўца.

**9 мая** — 95 гадоў з дня нараджэння Эдуарда Міцуля (1924—2002), эстраднага спевака, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь.

**9 мая** — 90 гадоў з дня нараджэння Людвіга Асецкага (1929—2005), графіка, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

**9 мая** — 90 гадоў з дня нараджэння Іосіфа Белановіча (1929—1998), мастака.

**9 мая** — 80 гадоў з дня нараджэння Івана Раманоўскага (1939—2004), мастака-дэкаратара.

**9 мая** 75-годдзе адзначае Генадзь Скабіцкі, скульптар.

**10 мая** 60 гадоў спаўняецца Тамары Бярэзінай, паэту.

**10 мая** — 90 гадоў з дня нараджэння Іраіды Пісьменнай (1929—2014), драматурга, сцэнарыста, журналіста, педагога.

**10 мая** 85 гадоў святкуе Аркадзій Новік, майстар дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва.

**10 мая** — 70 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Друкта (1949—1990), музыказнаўца, кампазітара.

**11 мая** — 120 гадоў з дня нараджэння Глеба Глебава (сапр. Сарокін) (1899—1967), народнага артыста БССР і СССР.

**11 мая** — 90 гадоў з дня нараджэння Дзмітрыя Алейніка (1929—2003), мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

**11 мая** 75-гадовы юбілей адзначае Марыя Шаўчонак, паэтэса.

**12 мая** 60 гадоў спаўняецца Мікалаю Алданаву, баяністу, дырыжору.

**13 мая** — 70 гадоў з дня нараджэння Сяргея Краўчанкі (1949—2014), заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь.

**14 мая** — 150 гадоў з дня нараджэння Янкеля (Якава) Кругера (1869—1940), мастака, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

**14 мая** 70-годдзе святкуе Лявон Сакалоў, плакатыст.

**15 мая** — 125 гадоў з дня нараджэння Мікалая Шчансновіча (1894—1969), акцёра, рэжысёра, заслужанага дзеяча культуры БССР.

**15 мая** — 105 гадоў з дня нараджэння Мікалая Гурло (1914—1980), графіка.

**15 мая** — 90 гадоў з дня нараджэння Алены Колас, кінарэжысёра-дакументаліста.

**15 мая** 70 гадоў адзначае Уладзімір Несцяровіч, празаік.

**16 мая** 50 гадоў спаўняецца Аліне Сабуць, паэту, літаратурнаму крытыку.

**16 мая** — 120 гадоў з часу першай публікацыі (1889) беларускай паэмы «Тарас на Парнасе» ў газеце «Мінскі лісток».

**16 мая** — 115 гадоў з дня нараджэння Савелія Браўдэ (1904—1981), рэжысёра дакументальнага кіно.

люстэрка тыдня

У Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі праводзяць III Велікодны фестываль «Творчасць маладых», які знаёміць з дзіцячымі і моладзевымі харавымі калектывамі Грузіі, Эстоніі і Расіі. Фэст мае на мэце цырымонію ўручэння прэмій прадстаўнікам прафесарска-выкладчыцкага складу, таленавітым навучэнцам акадэміі і гімназіі-каледжа пры БДАМ, якія спрыялі ўмацаванню высокага статусу прафесійнай музычнай адукацыі ў Беларусі і за мяжой. Форум праводзіцца пры падтрымцы Міністэрства культуры, спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, Пасольства Грузіі ў Беларусі і пры ўдзеле Свята-Елісавецінскага манастыра.

Турыстычны патэнцыял Беларусі прэзентавалі на XXVI Міжнароднай выстаўцы турызму і падарожжаў «Арабскі рынак падарожжаў» *(Arabian Travel Market)*, якая 1 мая завяршылася ў Дубаі (Аб'яднаныя Арабскія Эміраты), паведамілі ў Нацыянальным агенцтве па турызме. Гэта адна з галоўных міжнародных турыстычных выставак на Блізкім Усходзе. Беларусь была прадстаўлена і як міжнародная спартыўная пляцоўка. Наведвальнікі стэнда атрымалі кансультацыі аб II Еўрапейскіх гульнях, якія будуць праходзіць у Мінску 21—30 чэрвеня.

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі заўтра выпускае ў абарот паштовую марку «200 гадоў з дня нараджэння Станіслава Манюшкі», інфармуе прэс-служба РУП «Белпошта». Дызайн маркі распрацавала Алена Мядзведзь. Тыраж складае 49 тыс. Намінал маркі M адпавядае тарыфу на перасыланне міжнароднай простай паштовай карткі прыярытэтнай. У сталічным аддзяленні паштовай сувязі № 1 пройдзе спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень». Юбілейная дата — 200-годдзе з дня нараджэння Станіслава Манюшкі — занесена ў Спіс памятных дат ЮНЕСКА.

Выстаўка культуры Венесуэлы з нагоды 200-годдзя Нацыянальнага ўстаноўчага сходу ў горадзе Ангастуры адкрываецца ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Праект арганізаваны сумесна з Пасольствам Венесуэлы ў Беларусі. Экспазіцыя прадставіць каля 40 жывапісных партрэтаў знакамітых дзеячаў Венесуэлы перыяду барацьбы за незалежнасць паўднёваамерыканскіх народаў, сярод якіх — Сімон Балівар, Франсіска Міранда, Антонія Хасэ Сукрэ ды іншыя. Наведвальнікі ўбачаць карціны батальнага жанру з сюжэтамі значных бітваў, ключавых момантаў у гісторыі барацьбы за незалежнасць. Калекцыя таксама ўключае прадметы побыту, посуд, упрыгожванні, музычныя прылады. Выстаўка будзе працаваць да 20 мая.

Сад, градкі, пчольнік пад шклом — такі праект прапанавала адна з архітэктарскіх груп у якасці варыянта ўзнаўлення згарэлага даху сабора Парыжскай Багамаці, паведамляе БелТА са спасылкай на *The New York Post*. Праект прадугледжвае захаванне гістарычнага контуру будынка. Згарэлы дах і шпіль прапануюць замяніць сталёвай канструкцыяй, пакрытай шклянымі панэлямі, якія ўтвораць цяплічную прастору. Асобную тэрыторыю плануецца захаваць для пчол, якія жылі тут раней і выжылі пры пажары. Аранжарэйны комплекс можа быць выкарыстаны ў адукацыйных, дзіцячых і экалагічных праграмах.

**Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ**

**Беларусь, 2019. А для нас тая вайна яшчэ не скончана — гаворка не пра фармальны бок з капітуляцыяй, Нюрнбергскім працэсам і вяртаннем дадому воінаў-пераможцаў. Вялікая Айчынная працягваецца для нас — ментальна, калі звяртаемся да таго часу, вядзём дыялог з ім і тымі, хто для нас вызначалі будучыню. А мы жывём, усё яшчэ ўглядаючыся ў мінулае. І гэта ўласціва ўжо не толькі таму пакаленню, што заспела трагічныя падзеі, гэта ў нейкі момант стала вызначальным для грамадства. Вайна можа лічыцца скончанай, калі пахаваны апошні салдат, — і ставім абеліскі, аднаўляем помнікі, клапоцімся пра магілы тых, хто загінуў у баях ці пацярпеў у акупацыі. Стараемся, каб было па-людску… Аддаём доўг… Ці вельмі хочам паставіць кропку ў Перамозе над уласным страхам быць ахвярамі? Над страхам страціць сябе — як народ, нацыя, асобы (людзі)? Каб далей проста жыць і глядзець у будучыню, не азіраючыся. Калі так можна…**

**Пакуль не атрымліваецца. Нават з улікам таго, што сказана (і расказана) шмат самімі сведкамі. Увесь зямны боль, здаецца, увабрала ў сябе беларуская літаратура. Досвед для ўсяго чалавецтва — у творах Васіля Быкава, Аляся Адамовіча, Івана Шамякіна… Але пры тым з'яўляюцца новыя кнігі, пішуцца новыя творы, знаходзяцца новыя дакументы таго часу. Спроба паставіць кропку ў гэтай тэме абарочваецца шматкроп'ем. Ёсць траўмы, кажуць псіхолагі, якія трэба прагаворваць падрабязна некалькі разоў, каб пазбавіцца ўнутранай пакуты і далей будаваць жыццё і новыя адносіны з іншымі — са шчырасцю і на перспектыву.**

**Сёння звернемся да тых, хто дапамагаў прагаворваць. І да таго, што, можа, яшчэ засталося недагавораным.**

# Паэт-воін

Ёсць творцы, чые імёны стала асацыіруюцца з тэмай вайны, па чых творах пазнейшыя пакаленні могуць уяўляць глыбіню яе трагедыі для народа. Ёсць і тыя, хто, на ўласным досведзе прайшоўшы праз тыя самыя жахі і выпрабаванні, не набыў у чытацкім асяродку такую вядомасць. Але велічыня іх таленту не саступае тым, каго вывучаюць у школьнай праграме. Так, напрыклад, многія беларускія пісьменнікі лічаць, што ў ваеннай паэзіі Аляксей Пысін не слабейшы, чым Васіль Быкаў у ваеннай прозе.

...Бясснежны і марозны пачатак зімы 1943—1944 гадоў. Фронт на працяглы час прыпыніўся на рэчцы Проня пад Горкамі, Чавусамі, Прапойскам... На левабярэжжы Проні, пад Горкамі, побач з Польскай дывізіяй, салдаты якой прыйшлі сюды «пад сцягам Касцюшкі», занялі свае пазіцыі 9-я гвардзейская дывізія Чырвонай Арміі, у якой служыў малады паэт Аляксей Пысін. Камандзір роты узяў у салдата Пысіна яго шынель і апрануў на сябе, а яму аддаў свой камандзірскі кажух, белы-белы. На прамёрзлым чорна-шэрым лузе — вельмі добрая мішэнь для нямецкіх снайпераў. Верны сябар Аляксея паэт Віктар Ракаў пазней прысвяціў яму верш «Камсастаўскія кажухі гвардыі радавога Аляксея Пысіна», у якім ёсць такія радкі:

*Абраннік матухны-пяхоты,*
*Прайшоў жывым па ўсёй вайне,*
*Хоць быў пасечаны ўдвайне —*
*І за сябе,*
*І за камроты...*

Даўно стала аксіёмай, што Вялікая Айчынная вайна — гэта стрыжань, хрыбет маралі і духоўнасці беларускага народа. Шматлікія вершы-шэдэўры Аляксея Пысіна, такія, як «Вузел», «Была бранёю гімнасцёрка...», «Ляглі сябры ва ўсім паходным...», «Байцам не сняцца пантэоны», «Пяць патронаў у абойме...», «Іван-чай», «Сцяг», «Далёкі тупат кананады...», «Палім мы маршанскую махорку...», «Балада пра каску», «Валуеў», «Балада пра начлег», «А хтосьці з той стралковай роты...», «Балада аб чаканні», «Кінаэпапея "Вялікая Айчынная"», «Балада Буйніцкага поля», а яшчэ паэмы «Белы камень» і «Кара», таксама як і пераклады твораў Мусы Джаліля і Міхаіла Хонінава — сведчанне таго, што савецкі салдат — гэта мужны воін-патрыёт, гуманны воін-вызваліцель, які змагаецца са злом і сее зерне дабрыні, б'ецца з ворагам да апошняга дыхання, пралівае сваю кроў і нават ахвяруе жыццём за народ і Айчыну.

Аляксей Пысін быў салдатам-сувязістам. У «Баладзе пра сувязіста» ён адметна, па-майстэрску ярка і вобразна малюе франтавыя будні:

*Цераз Волгу, Дняпро ў далеч палёў*
*Провад свой*
*вёў,*
*вёў.*
*Провад вёў праз агонь, праз лясы,*
*Вёў у провадзе галасы...*
*Вёў і загад — па агонь,*
*На атаку загад,*
*Абрываў галасы*
*снарад...*
*Два канцы зубамі сціскаў,*
*Каб жывым провад зноў стаў.*
*Поле міннае — смерці схоў,*
*Спатыкнуўся Аляксей Весялоў.*
*Расступілася перад ім зямля,*
*Сувязіста з провадам узяла.*

Паэт нібы наяве бачыў палеглых сяброў, якія ўзышлі травой і гарыцветам, і «гутарыў» з імі як з жывымі:

*...Вунь Іван стаіць па-над кюветам.*
*Галавой ківае: «Вось жыву...*
*Хочаш — пачастую чаем,*
*Я ж цяпер навекі вадахлёб».*
*— Не, Іване, з чаем пачакаем,*
*Закурыць не лішне нам было б.*

Не раз паэт-франтавік згадваў і горацкія вёскі, у вызваленні якіх прымаў удзел у чэрвені 1944 года, калі пасля лячэння ў армейскім шпіталі вярнуўся ў сваю роту.

Пры нагодзе Аляксей Васільевіч абавязкова наведваў Горкі і сяло Леніна, выязджаў адпачываць на Проню. Бываў і ў Слаўгарадзе, і ў Чавусах.

На горацкай зямлі, у музеі ратнай славы сяла Леніна, яму падарылі капсулу са жменькай зямлі, якая ў вайну была паліта гарачай крывёю польскіх і савецкіх воінаў. Тую капсулу паэт-воін трымаў у сваім рабочым кабінеце на заўважным месцы. У 1960 годзе паэт прысвяціў горацкай зямлі верш «Курганы». У вершы «Знаёмства з вёскай Аўсянка» (пра сібірскую вёску Аўсянка) паэт згадаў і горацкую вёску Аўсянка. Пасля апошняй паездкі ў Горкі і Леніна ў студзені 1981 года паэт напісаў верш «Дарогай на Панкратаўку», таксама пра горацкую вёску.

...Як толькі вызвалілі Горкі, гвардзеец Пысін са сваёй дывізіяй крочыць далей, на захад, палямі і лясамі Віцебскай вобласці. Воддаль яго шляху злева была Орша, а справа — Віцебск. Апошнім прыпынкам на віцебскай зямлі стаў старажытны Полацк. Крывавы бой пад Полацкам яму вярэдзіў душу шмат гадоў пасля вайны. Былы салдат Пысін у той бой вяртаўся не адзін раз і ў мірны час.

— На вайне як на вайне... — дзяліўся ўспамінамі Аляксей Васільевіч, — пад Полацкам наш батальён паспяхова выбіў ворага з траншэй, бліндажоў, дотаў. Нават апярэдзіў час ці, можа, спазніліся самалёты. І пасыпаліся на нашых салдатаў бомбы... з нашых жа самалётаў:

*Пярэдні край зламалі ўжо штыкі,*
*Ужо за намі бліндажы і доты,*
*Спазніліся сюды штурмавікі:*
*Пяхота абагнала самалёты.*
*Пакуль камбат хрысціў чыесці душы, —*
*Ляглі свае... Ляглі свае...*

Гаворачы пра вайну, Аляксей Пысін праявіў сябе як паэт-вяшчун, мысліцель, адкрывальнік сэнсу жыцця і інтэлектуал, лічыць літаратуразнаўца Таццяна Хоміч. Ён — унікальны Майстар беларускай паэзіі, а ў паказе вайны ён першы і самы моцны з усіх беларускіх паэтаў. Яго можна параўнаць хіба з Канстанцінам Сімнавым і Аляксандрам Твардоўскім.

**Віктар АРЦЁМ'ЕЎ**


Фота Максіма Тарналіцкага, onliner.by

# Поле трывогі і роспачы

## Вялікая Айчынная вайна і любоў да Кафкі

У беларускай літаратуры за савецкім часам тэма Вялікай Айчыннай вайны набыла для нашай краіны сакральнае значэнне, што, безумоўна, мела сваё адпаведнае выяўленне ў нашым мастацтве. Таму нядзіўна, што гэтая важная для нас тэма была асноўная. Фактычна не было такога айчыннага пісьменніка, які хаця б адзін твор не прысвяціў трагічным падзеям 1941—1945 гг.

Вядома, хапала твораў і кан'юнктурна-плакатных, пазбаўленых праўдзівага пачуцця болю. Асабліва такога кшталту літаратуры было створана да хрушчоўскай адлігі. Ды што казаць: нават такога класіка, як Міхась Лынькоў, дастаткова моцна крытыкаваў Якуб Колас за яго эпапею «Векапомныя дні».

Але пачынаючы з другой паловы 1950-х асобныя смелыя творцы маглі выказацца нават у гэтай тэме з дастаткова смеласцю, мастацкай выразнасцю.

Згадаем хаця б Івана Шамякіна.

Для многіх, далёкіх ад уважлівага прачытання нашай літаратуры снобаў, ён — прыклад савецкага пісьменніка, які друкаваў толькі тое, чаго патрабавала сістэма.

Але падобнае меркаванне памылковае. Ува многіх сваіх аповесцях і раманах ён нават больш смелы і востры, чым Васіль Быкаў.

У пенталогіі «Трывожнае шчасце» менавіта Шамякін паказаў страшны ў сваёй дзюрэраўскай праўдзівасці вобраз пасляваеннай вёскі, калі людзі літаральна пухлі з голаду, калі пачуццё разгубленасці, адчаю і незадаволенасці было такім моцным, што ўвесь пафас перамогі проста губляўся, раставаў, як дым. Шамякін паказаў не горды народ-пераможцу, а падманутых ахвяр сістэмы, якія, прагнуўшы са сваіх земляў нацысцкіх акупантаў, працягваюць пакутаваць...

Легендарны твор таго ж Івана Пятровіча «Гандлярка і паэт» уражвае амаль апакаліптычнай карцінай панікі, калі ў Мінск павінны былі прыйсці першыя нямецкія войскі.

Пісьменнік (першым сярод беларускіх савецкіх літаратараў!) апісвае з праўдзівай жорсткасцю вядомыя эпізоды, калі з горада палахліва ўцякала савецкае начальства, як людзі, кінутыя і разгубленыя, пачалі рабаваць прадуктовыя крамы і склады. У пісьменніка няма ні ценю асуджальнасці. Ён спачувае бедным мінакам, выяўляючы з незвычайнай смеласцю іх страх, адчай, разгубленасць.

Згаданы ўжо Васіль Быкаў паказваў вайну з іншага боку. Для яго, расчараванага мізантропа, прыхільніка Альбера Камю і Франца Кафкі, было важным выявіць у сваіх аповесцях тую страшную праўду, што найбольшы страх уяўлялі сабой не столькі нацысцкія войскі, колькі… мы самі. У яго балючых, мінімалістычна-камерных творах маці выдае сваіх сыноў паліцыі, шчыры смелы партызан нечакана становіцца катам свайму таварышу, афіцэр асабіста прычыніў атраду больш гора і пакуту, чым нямецкія танкавыя калоны, якія іх безупынна атакуюць.

Праціўнік сталіншчыны і ўсялякіх праяў таталітарызму Андрэй Макаёнак у сваім шэдэўральным «Трыбунале» паказаў, якія жахі можа тварыць са звычайнай сялянскай сям'ёй ідэалогія, што яны гатовыя роднага бацьку закінуць у мяшок і патапіць, бы тое сляпое кацяня.

Іван Чыгрынаў увогуле паказаў вайну з нейкага сюррэалістычнага гледзішча.

Чытаеш яго шэдэўральны «Плач перапёлкі» і ловіш сябе на думцы, што трапіў у нейкі кашмарны сон. Вёска, нейкія бясконцыя хвоі, балоты, туман, адзінокае ласяня, што блукае ў лесе, бязмэтна-наркатычныя вандроўкі героя па фантасмагарычным ланшафце, немцы, якія з'яўляюцца ў гэтым дзіўным сне нейкімі размытымі чорнымі плямамі, — падобны погляд на вайну, безумоўна, уражвае... Ніхто з нашых тагачасных пісьменнікаў не пераўзышоў яе на старонках сваіх твораў у такі кашмарны, пякельны сон, дзе пануе злавесны алагізм, хаос, падкрэсленая бессюжэтная хісткасць, якая надае яшчэ большай трывогі і роспачы.

У 1960—1970-я быў найвялікшы росквіт ваеннай літаратуры.

Найлепшыя нашыя пісьменнікі, якім было, безумоўна, цесна ў сацрэалістычных межах, марылі ствараць паеўрапейску смелыя творы. Прыхільнікі экзістэнцыялістаў, сюррэалістаў, мадэрновай літаратуры, яны імкнуліся гэта прыўнесці і ў сваю прозу, паэзію, драматургію. Дазволеная і ўсяляк прапагандаваная ў той час сістэмай тэма Вялікай Айчыннай вайны была выдатнай нагодай для нашых літаратараў выказаць набалелае, узбагаціць беларускую літаратуру драматургічна і эстэтычна, здзівіць як тагачаснага чытача, так і сённяшняга новымі ідэямі і тэмамі.

Нездарма і зараз сярод самых папулярных айчынных творцаў згадваюць Івана Шамякіна (перадусім яго «Гандлярку і паэта»), Васіля Быкава, не названага тут аднаго з самых смелых і радыкальных творцаў Алеся Адамовіча, аўтара сцэнарыя да наймацнейшага беларускага фільма на гэтую тэму «Ідзі і глядзі».

**Васіль ДРАНЬКО-МАЙСЮК**

# Каштоўнасць шчырасці




Праз доўгія гады да нас даходзяць успаміны і роздумы тых, хто змагаўся за свой народ падчас вайны. Тыя простыя людзі, якія ўжо сталі далёкімі вобразамі сапраўдных герояў, ажываюць на старонках кніг. Аповесць «Салдаты ДАКа № 205» («Солдаты ДОТа № 205», Мінск, Выдавецкі дом «Звязда», 2019) — твор, напісаны франтавіком Рыгорам Шакулавым па апавяданнях Аляксандра Гілепа, непасрэднага ўдзельніка апісаных ваенных падзей. Атрад ДАКа № 205 меў свой паходны журнал, які таксама паслужыў асновай для стварэння твора.

Па сюжэце атрад у выніку сутыкнення з нямецкімі салдатамі вымушаны пакінуць ДАК. Адрэзаныя ад арміі, байцы крочаць па лясах і вёсках Віцебшчыны і Смаленшчыны, каб у рэшце рэшт працягнуць змагацца не ў тыле ворага невялічкай групай, а ў баях за вызваленне Савецкага Саюза. Нягледзячы на сваю нешматлікасць, атрад за час вандровак пусціў пад адхон некалькі нямецкіх эшалонаў, выратаваў вялікую групу савецкіх палонных, знішчыў дзясяткі фашыстаў і, аб'яднаўшыся з арміяй, больш як месяц утрымліваў хутары. За гэты час ён страціў толькі некалькі байцоў. У эпілогу распавядаецца, як салдаты ДАКа № 205 удзельнічалі ў адваёўванні лініі фронту і толькі восенню 1943 года вярнуліся на беларускую зямлю.

Першы раздзел пачынаецца са сказа: «Няроўны бой». Такі выраз без усялякай падрыхтоўкі ці прадмовы ўводзіць чытача ў складанасць сітуацыі, даючы зразумець: гэта і ёсць раптоўнасць вайны. Але на старонках персанажы ўмелыя, дасведчаныя і ўпэўненыя ў сваёй перамозе (а аснову твора складаюць падзеі лета 1941 года). Галоўны герой — камандзір роты Мікалай Шчарбакоў — апісаны як сапраўдны храбрэц, удумлівы, сціплы, справядлівы. Ён ніколі не перастае думаць аб тым, каб знішчыць як мага больш ворагаў. Пытанне захаваць жыццё салдат і сваё не стаіць. Перад чытачом — вобраз савецкага афіцэра, які ў нейкім сэнсе абясцэньвае свае дасягненні. Шчарбакоў, зрабіўшы шмат для народа ў тыле ворага, выказвае думку: усё ж недастаткова. Менавіта ў гэтым і ёсць адна з галоўных характарыстык савецкага чалавека: у цяжкіх і непрадказальных умовах не толькі выканаць, але і перавыканаць. Упершыню руйнуючы чыгунку, камандзір вельмі шкадуе тую цяжкую працу, што была ў яе ўкладзена. Гэта выпрабаванне — зламаць сваё, хоць і дзеля карысці, — зноў-такі сведчыць пра душэўную сілу савецкага ваеннага.

Падчас змагання ўсе пачуцці без выключэння падзяляюць з камандзірам і іншыя героі, у тым ліку ваенфельчар Васіль Арэхаў, прататып якога — Аляксандр Гілеп. Нават калі каманда пакінула параненага байца ў адной з вёсак, той згадзіўся: яго будуць даглядаць надзейныя савецкія людзі. Вобраз станоўчага савецкага чалавека — асноўны элемент твора. Відаць, што мэтай аўтара было паказаць: менавіта савецкі народ пацярпеў больш за ўсіх, але перамог. Гэты героіка-патрыятычны пафас чытаецца і ў вобразах цыгаркі, якую кураць усе салдаты па чарзе і якую хаваюць, каб ніхто здалёк не ўбачыў дым, у воклічы «служым Савецкаму Саюзу», у кожнай размове з вяскоўцамі, якія просяць салдат не здавацца і абараніць Радзіму. І гэта менавіта тая шчырасць, якая так падкупляе і прымушае звяртацца да тэмы.

Дарэчы, у аповесць уключаны два вершы Рыгора Шакулава 1942 і 1943 гадоў. Гэта водгук ваеннага на тое, што ён адчуваў, бачачы разбурэнне на свае вочы. Назвы гэтых твораў — «Сляза камандзіра» і «Кветкі, апырсканыя крывёй» — кажуць самі за сябе.

Мы назіраем, якой была і як трансфармуецца тэма вайны ў літаратуры і кіно. Кожны, абапіраючыся на асабісты светапогляд, робіць свае высновы. Але відавочна, аснова ўсяго, што стваралася і ствараецца, — досвед, што, перш за ўсё, пражываўся самімі ўдзельнікамі тых жудасных падзей і перадаваўся людзям, якія не ведалі, што такое вайна, і якія ў далейшым мелі магчымасць трансляваць гэты досвед так, як падавалася патрэбным. Але «Салдаты ДАКа № 205» — шчыры зварот удзельнікаў падзей, які дайшоў да нас у выглядзе, якім яго хацелі бачыць тыя салдаты. І ў гэтым яго каштоўнасць.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

**Ніна Ільіна, дачка Рыгора Шакулава, аднаго з аўтараў кнігі:**

— Адзін з аўтараў кнігі Аляксандр Гілеп, ураджэнец Слуцка, служыў у кулямётнай роце асобнага кулямётнага батальёна Полацкага ўмацраёна, быў сярод абаронцаў гэтага ДАКа, стаў правобразам аднаго з галоўных герояў — ваенфельчара Васіля Арэхава. Ён вёў дзённік атрада па даручэнні камандзіра. У 1960-я гады, калі з'явілся думка напісаць кнігу пра тыя падзеі, даручылі гэта зрабіць майму тату, які ўжо быў аўтарам некалькіх кніг.

Тата таксама быў удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, ваяваў на Ленінградскім фронце. Нарадзіўся ён пад Віцебскам, у вёсцы Паўлавічы, у вялікай шматдзетнай сялянскай сям'і. У Ленінград паехаў вучыцца ў лесатэхнічную акадэмію. Адначасова вучыўся ў літаратурным інстытуце пры Доме пісьменнікаў імя Маякоўскага. У 1939 годзе ажаніўся з маёй мамай, якая была карэннай ленінградкай. У верасні таго ж года яго накіравалі ў экспедыцыю складаць карту апісання тайгі, а ў наступную экспедыцыю ў 1940 годзе яны паехалі з мамай разам. Там яна нарыхтавала шмат ягад і сушаных грыбоў, а потым ва ўспамінах пісала, што гэта, напэўна, дапамагло выжыць падчас блакады…

Тата пайшоў дабравольцам у народнае апалчэнне на пачатку ліпеня 1941 года. Спачатку былі вучэнні, а потым іх накіравалі пад Гатчыну. У мяне захаваліся лісты, якія тата пісаў маме з фронту. Часткова я іх перадала ў музеі ці архівы. Ёсць і яго ліставанне з роднымі з Беларусі. У верасні 1941 года бацька быў паранены, але і ў шпіталі працягваў змагацца з ворагамі — пісаў вершы, якія заклікалі на барацьбу (чытачы кнігі гэта адчуюць). Ён узнагароджаны 11 медалямі, з іх 4 баявыя. Ёсць узнагарода «За абарону Ленінграда» і ордэн Вялікай Айчыннай вайны І ступені.

У 60-я гады бацькі пераехалі ў Віцебск, дзе тата і працаваў над ваеннай аповесцю. Яе рукапіс захоўваецца ў музеях Полацка. Але сама яна цалкам выдадзена фактычна толькі цяпер. У 1966 годзе ў віцебскай газеце «Атака» друкавалася толькі першая глава. У 2009 годзе яе друкавалі ў скарочаным выглядзе ў газеце «На страже родины» ў Санкт-Пецярбургу.

Калі бацька памёр (у 1987 годзе), я паабяцала, што прыкладу ўсе намаганні, каб выдаць усё, што ён напісаў. Яго праца была звязана з лесам, з прыродай, і ён стварыў чароўныя казкі на гэтую тэму. Да 100-годдзя бацькі я і мае дзеці вырашылі за свае грошы стварыць выданне яго лепшых казак — яны як для маленькіх, так і для дарослых чытачоў. А напрыканцы мінулага года ў Санкт-Пецярбургу была выдадзена кніга «Салдаты ДАКа № 205». Але беларускае выданне атрымалася больш якаснае дзякуючы Выдавецкаму дому «Звязда».

**Марыя АСІПЕНКА**

# За безаблічнымі лічбамі




Тэма вайны заўжды была і будзе актуальная ў айчыннай літаратуры: надта ж вялікую цану заплаціў беларускі народ за перамогу над фашызмам, надта ж вялікія страты панёс… Адыходзіць пакаленне тых, чыё дзяцінства выпала на ваенныя гады, амаль адышло пакаленне тых, хто змагаўся ў армейскіх шэрагах, партызаніў у лясах, вёў падпольную барацьбу ў тыле. І кожная наступная генерацыя пераасэнсоўвае той страшны і адначасова гераічны досвед змагання па-свойму. Для чагосьці ж гэта патрэбна…

У выданні, якое сёлета пабачыла свет у выдавецтве «Беларусь», на аснове дакладных гістарычных фактаў і матэрыялаў разглядаюцца падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Адлюстроўваюцца не толькі ваенныя дзеянні на тэрыторыі нашай краіны, але і метады дзяржаўнага кіравання ва ўмовах вайны.

Кніга Віктара Ермаловіча «Беларусь. Шлях да Вялікай Перамогі» пачынаецца з раздзела, дзе падрабязна разглядаюцца і аналізуюцца міжнародныя адносіны, якія папярэднічалі вайне. Урады краін, якія былі зацікаўленыя ў захаванні вынікаў Версальскага мірнага пагаднення, бо яно забяспечвала ім пануючы стан у сусветнай супольнасці, імкнуліся скіраваць германскую агрэсію супраць краіны-саперніцы — СССР. Гэта, а таксама ідэалагічная прычына вайны названы аўтарам як адны з галоўных.

Асобныя раздзелы кнігі распавядаюць пра становішча Беларусі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, яе пачатак, пра нямецкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі, партызанскі і падпольны рухі, а таксама вызваленне Беларусі ад нямецких акупантаў. Адзін з самых цікавых расповедаў у выданні ўключае гісторыю ўваходжання Беларусі і Украіны — толькі дзвюх рэспублік СССР, — у склад заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый як краін, якія ўнеслі значны ўклад у справу антыгітлераўскай кааліцыі.

Кожны раздзел выдання багата ілюстраваны фотаздымкамі з архіва выдавецтва «Беларусь». Адметна, што яны былі зроблены не толькі на тэрыторыі краіны, але і па-за яе межамі. Можна бачыць, з якімі незадаволенымі тварамі ў 1939 годзе сустракалі гітлераўцаў жыхары Прагі, адгароджаныя ад іх урачыстага шэсця «жывым ланцугом» немцаў, з якой разгубленасцю і нават безвыходнасцю ў вачах жонкі і дзеці праводзілі сваіх мужоў і бацькоў, якія ў якасці палонных адбывалі ў Германію… Шмат трагічных момантаў жыцця сталіцы і іншых беларускіх мясцін падчас акупацыі праілюстравана здымкамі: шыбеніца з пакаранымі на ёй, група падпольшчыкаў, якіх вядуць на пакаранне (пад аховай атрада ўзброеных немцаў зусім юныя дзяўчына з хлопцам ды малады чалавек, ва ўсіх звязаныя за спінай рукі і ні ценю страху ці шкадавання ў позірку), расстраляныя вяскоўцы, ахвяры лагероў смерці…

Цяпер, калі з руін і попелу адрадзіліся гарады і вёскі краіны, калі вырасла некалькі пакаленняў, якія не бачылі вайны, важна памятаць тое, што кожны шматок зямлі, па якой мы ходзім, насычаны пакутамі тых, хто на ёй загінуў. І гэта не сухія безаблічныя калонкі лічбаў у статыстычных дакументах, а людзі, якія любілі жыццё, песцілі сваіх дзяцей, клапаціліся пра бацькоў, шчасліва глядзелі ў вочы каханых. Былі такія ж, як і мы. А многія толькі пачыналі жыць і раскрывацца насустрач свету пяшчотнымі кволымі кветкамі, безабароннымі ў сваёй прыгажосці... Каб памяталі — гэтай мэце і служыць выданне Віктара Ермаловіча, пад вокладкай якога змясцілася шмат лёсаў нашых суайчыннікаў тых трагічных часоў. Яно прызначана ўсім, хто хоча пачуваць сябе шчаслівым пад мірным небам Айчыны…

**Яна БУДОВІЧ**

# Героі, проста людзі

У жорсткіх баях за вызваленне Быхаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вызначыліся сотні, тысячы савецкіх воінаў. Пра гэтых выдатных людзей расказвае пісьменнік і журналіст Мікола Леўчанка ў новай кнізе «Героі вызвалення» (Магілёў, МДУ імя А. Куляшова, 2018). У нарысах, якія ўвайшлі ў зборнік, апавядаецца пра мужных воінаў — радавых, афіцэраў і генералаў, якія за подзвігі ў гады Вялікай Айчыннай вайны былі адзначаныя найвышэйшай узнагародай Радзімы — Залатой Зоркай Героя Савецкага Саюза ці ордэнам Славы ўсіх трох ступеняў.




Аўтар стварыў яркія вобразы адважных байцоў і камандзіраў — прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, якія пралівалі сваю кроў, а многія загінулі геройскай смерцю ў баях за свабоду і незалежнасць Беларусі. Гэта і беларусы Іван Барысевіч, Уладзімір Карніенка, і рускія Пётр Данілаў, Пётр Вінічэнка, Барыс Каваленка, Уладзімір Мартынаў, Яфім Фрадкоў, Сцяпан Ушакоў, Сяргей Грышын, Міхаіл Еншын, Аляксандр Гарбатаў, і казах Сундзеткалі Іскаліеў, і грузін Галактыён Размадзэ, і украінец Сідар Кульбашной, і ўзбекі Мухітдзін Умурдзінаў, Гулям Якубаў і іншыя. Многія з іх праславіліся пры ўзяцці знакамітай вышыні 150,9 каля вёскі Лудчыцы. Цяпер пра іх подзвіг нам нагадваюць Курган Славы і ўстаноўленая тут стэла ў гонар Герояў…

Пяру Міколы Леўчанкі належаць таксама кнігі «Урокі мужнасці», «Крылатая гвардыя» і іншыя, у якіх ён расказаў пра байцоў і камандзіраў Савецкай Арміі, ураджэнцаў Быхаўшчыны, а таксама пра лётчыкаў 57-й Чырванасцяжнай марской ракетаноснай авіяцыйнай дывізіі, якая пасля вайны і да 1992 года дыслакавалася ў заходняй частцы горада Быхава. У гэтай дывізіі служылі 30 Герояў Савецкага Саюза і 2 Героі Расіі.

Пісьменнік Мікола Леўчанка — аўтар дзясятка кніг прозы і паэзіі, лаўрэат многіх літаратурных і журналісцкіх прэмій, ганаровы грамадзянін Быхаўскага раёна — праслаўляе сваю малую радзіму, яе жыхароў і ўсіх выдатных асоб, якія вызвалялі Беларусь ад акупантаў, зрабілі значны ўнёсак у Вялікую Перамогу.

**Міхась СЛІВА**

# Адзінокі і горды



Платон Галавач займаў высокія пасады. Ён быў і першым сакратарам ЦК ЛКСМБ, і рэдактарам газеты «Чырвоная змена», і намеснікам наркама асветы БССР. Акрамя таго, з'яўляўся адным з кіраўнікоў літаратурных арганізацый «Маладняк», БелАПП, рэдагаваў часопісы «Маладняк» і «Полымя». На першы погляд — тыповы савецкі начальнік, які займаў ідэалагічна правільныя пазіцыі і мусіў абслугоўваць партыю, як выразнік яе інтарэсаў.

Актыўна выступаў у канцы 1920-х супраць «Узвышша» і Міхася Зарэцкага. Называў Фета, Бальмонта, Ахматаву «адрыжкамі мінулага», параўноўваў іх са «старымі заляжалымі ўборамі, якія сьмярдзяць нафталінам...» (цытата з артыкула «Сарваць маску!» // «Савецкая Беларусь», 1929, № 298). У нарысе «Ад Мядзведжай гары да Белага мора» (1934) пісаў пра вельмі чалавечнае стаўленне работнікаў ГПУ да зняволеных: «На Беламорбудзе было сабрана некалькі дзесяткаў тысяч былых злачынцаў… Да іх у лагеры АДПУ аднесліся як да людзей, паказалі мэту, вартую вялікай адвагі і геройства … забяспечылі вопраткай, харчамі, вучобай і навучылі працаваць…»

Але разам з тым Платон Галавач, як ніхто з тагачасных беларускіх пісьменнікаў канца 1920-х — пачатку 1930-х гг., здзіўляў і чытачоў, і крытыку непрыхаванай змрочнасцю ўласных твораў. У яго навелах, апавяданнях і аповесцях мы не знойдзем бестурботнай радасці і апявання светлай будучыні.

Тут пануе туга, трывога, востры сум, прадчуванне бяды і вялікая незадаволенасць рэчаіснасцю.

Знарочыстая адсутнасць радасці ў прозе Галавача злавала тагачасных літаратурных экспертаў.

Мовазнаўца Мікола Байкоў з непрыхаванымі ноткамі раздражнення пісаў: «…ценевыя бакі блізка што зусім засяняюць сьветлыя зьявы рачавістасьці; …блізка што не выяўляюцца дадатныя бакі комуністычнага будаўніцтва ў вёсцы. /.../ Няможна ў працягу бітых шасьцімі гадзін чытаньня кніжкі даваць больш ценевыя бакі нашай рачавістасьці і толькі на 2—3 хвіліны выво-дзіць на сцэну ідэальных прадстаўнікоў новага ладу» (М. Байкоў. «Платон Галавач. "Дробязі жыцьця"». // «Полымя», 1927, № 3).

Крытык Б. Каваленка абурана адзначаў, што ў творчасці Платона Галавача адчуваецца «...уплыў дробнабуржуазнага аб'ектывізму, паглыбленьне ў індывідуалістычную псыхалёгію…» Аналізуючы яго апавяданне «Уцякач» Каваленка з вялікім запалам піша: «…дээртыр у апавяданьні "Уцякач"... нічым дрэнным не адрозьніваецца ад сваіх таварышаў-чырвонаармейцаў і калі ўцякае з фронту, то толькі пад уплывам "жахаў вайны", якія ня можа вытрымаць яго "тонка арганізаваная псыхіка". Мы бачым у ім простага чалавека, які пратэстуе супраць бессэнсоўнага зьніштажэньня сваёй асобы, які стыхійна любіць жыцьцё і ўсё жывое /.../ аўтар не выкрывае клясава-варожай існасьці дээртырства, і таму сам расстрэл зьяўляецца проста жорсткасьцю... У аповесьці "Вінаваты" аўтар дае "трагэдыю" партыйца, сацыяльна-чужога паходжаньня, [якога] выключаюць за соцыяльнае паходжаньне: бацька да рэвалюцыі служыў у ахранцы /.../ "Праблема" не асабліва характэрная, а галоўнае, не асабліва значная для інтарэсаў клясавай барацьбы пралетарыяту. /.../ бацька-ахраньнік па ходу дзеяньня прадстаўлены ня дрэнным чалавекам, які толькі дзякуючы сваёй нявопытнасьці "паступіў на службу" ў ахранку» (Б. Каваленка. «Платон Галавач» // «Маладняк», 1932, № 2—3).

Так, Платон Галавач не хаваў свайго здзіўляльнага жадання заступацца за тых, хто па логіцы з'яўляўся «ворагам народа». Ад яго чакалі бязлітасна-пракурорскіх допісаў, а ён быў адвакатам тым бедакам, якія з'яўляліся лішнімі людзьмі падчас першай хвалі рэпрэсій пачатку 1930-х гг.

Калі толькі пачыналі крытыкаваць і абвінавачваць маладых Яна Скрыгана альбо Масея Сяднёва, менавіта Платон Галавач падстаўляў ім плячо, натхняў, ратаваў.

Больш за тое, дазваляў сабе крытычныя выпады на такія «святыя» рэчы, як «сацыялістычны рэалізм».

Напрыклад, у артыкуле «Ці патрэбна нам навэла?» выказвае такія «рэакцыйныя думкі»: «У нас, на старонках газэт … вы знойдзеце навэлу пра лепшую даярку, пра лепшага свінара, конюха. З навэлы вы можаце, верачы словам аўтара, даведацца, што даярка і свінарка і конюх у калгасе амаль раней за ўсіх ідуць на працу і пазней прыходзяць з працы, што ў іх свінарніку і ў хляве чыста … не даведаецеся вы ніколі затое таго, якія ж у герояў фізіяноміі, які ў іх склад мыслення, якія страсці, жаданні, пачуцці, імкненні. /.../ Часта рэдактары не глядзяць, ці ёсць у апавяданні думка, вобраз, пачуццё, а задавальняюцца тым, што ёсць тэма. У нас часцей гавораць пра добрыя тэмы і пра вялікія ідэі, а не пра добрыя творы».

Платон Галавач пакутваў у 1930-я гады ад падобнай адсутнасці шматгранных, псіхалагічна глыбокіх твораў. Плакатнасць тагачаснай літаратуры яго асабіста эстэтычна абражала, а таму ў апавяданнях і аповесцях стараўся як мог стварыць нешта адметнае і па-мастацку незвычайнае, хоць гэта і злавала дагматычных крытыкаў.

У аповесці «Вінаваты» ён перадаў праўдзівы вобраз савецкай сістэмы. Ад галоўнага героя, былога савецкага чыноўніка, падчас чысткі адвярнуліся таварышы, ён стаў нікому непатрэбны, яму не вераць, ён непрыкаяным бесхацінцам бадзяецца па непрытульнай Беларусі і сутыкаецца з халоднай абыякавасцю. Тут Галавач адзін з першых паказаў, як лёгка савецкая сістэма выкідае і пазбываецца непатрэбных ёй людзей, як адзін асобна ўзяты чалавек нічога не варты і не здольны даказаць відавочную невінаватасць.

Класічны твор «Спалох на загонах» нават і пасля шматлікіх перапісванняў і рэдакцый не перастае здзіўляць.

Гэта, ізноў жа, адзін з першых яркіх беларускіх твораў, які паказвае непрыняцце сялянамі калектывізацыі. Ніякімі спосабамі немагчыма ім давесці, што калгасы — гэта паратунак. Аповесць працята амаль апакаліптычным адчуваннем паразы. Прытым не сялян, а галоўнага героя, які ўсімі сіламі хоча стварыць калгасны рай.

У апошніх абзацах твора Галавач малюе жудасную смерць гэтага персанажа. Ён знаходзіцца адзін на полі. Раптам з'яўляюцца маўклівай змрочнай хмарай сялянкі, узброеныя рознымі сельскагаспадарчымі прыладамі. Яны марудна набліжаюцца, акружаюць сваю ахвяру і з такой жа страшнай маўклівасцю забіваюць, фактычна змешваюць з зямлёй, а разам з тым хаваюць усялякія спадзяванні, што хоць калі-небудзь прымуць для сябе калгасы.

І, што самае цікавае, калі чытаеш гэту сцэну, адчуваеш, што Платон Галавач не асуджае сялянак. Ён з жорсткім фаталізмам паказвае, што калгас і сяляне — рэчы несумяшчальныя, і спроба іх спалучыць можа прывесці толькі да вялікай трагедыі.

Дзіўна, але Галавача абмінулі першыя дзве хвалі рэпрэсій (1930 і 1933 гг.). Не арыштавалі яго і ў 1936-м. Узялі пісьменніка толькі праз год. Катавалі так, што Станіслаў Шушкевіч, калі выпадкова пабачыўся з ім у турэмным калідоры, не адразу пазнаў.

Яго дзіўныя творы цяжка назваць да канца рэалістычнымі. Фрагментарнасць і не зусім стройная кампазіцыя надае ім нават пэўную мадэрновасць, нервовую няўстойлівасць, якая выдатна адпавядае таму востраму настрою, у якім жыў аўтар і яго сучаснікі.

Галавач моцны не стылем, а настроем, пачуццём вечнай тугі — прадчуваннем хуткага канца, ад якога не застрахаваныя не толькі галоўныя героі, але і іх каты. Пісьменніка захапляла, напрыклад, што ў фінале навелаў Мапасана «беспрасветны адчай..., глыбокі песімізм», а ў творах Скрыгана «гучыць то ледзь улоўна, то больш моцна тужлівая нота. ...элемент трагічнага». А найлепшай навелай Васіля Каваля называў «Нянавісць» (1936 г.), бо там хвалюе «Незвычайны трагізм, якім насычаны змест... Уражанне пасіляецца тым, што страляе ў бацьку сын».

Платон Галавач не ўмеў маніць, не умеў прыстасоўвацца. Заставаўся шчырым, як у творчасці, так і ў паўсядзённасці. Не хаваў сваіх поглядаў. Яго дзівоснаму нежаданню мімікрыраваць, гордаму адстойванню ўласнай годнасці можна і трэба вучыцца цяпер.

Такія, як Платон Галавач, — рэдкасць у нашай літаратуры.

**Васіль ДРАНЬКО-МАЙСЮК**

---

## «Уладзімір Караткевіч»: энцыклапедычнае прачытанне

Сярод новых праектаў, якія знаходзяцца ў распрацоўцы ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», — персанальная энцыклапедыя «Уладзімір Караткевіч».

Варта нагадаць, што, пачынаючы з 1986 года ў энцыклапедычным выдавецтве краіны ўжо выходзілі персанальныя энцыклапедыі: «Янка Купала», «Францыск Скарына», «Максім Багдановіч». Зусім нядаўна была перавыдадзена энцыклапедыя «Янка Купала» — ужо ў трох тамах замест ранейшага аднатомнага энцыклапедычнага слоўніка.

Беларусь багатая на імёны асветнікаў, класікаў нацыянальнай літаратуры. І, несумненна, яшчэ прыйдзе час, калі з'явяцца грунтоўныя выданні, прысвечаныя Якубу Коласу, Кузьму Чорнаму, Васілю Быкаву, Льву Сапегу, іншым айчынным знакамітасцям. А зараз энцыклапедысты распрацавалі слоўнік артыкулаў, якія павінны ўвайсці ў персанальную энцыклапедыю, прысвечаную аўтару «Дзікага палявання караля Стаха».

Мяркуецца, што жыццё і творчасць Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча будуць раскрытыя праз 656 артыкулаў: ад «Абабурка М.» да «Яскевіч А.». Адрасы, па якіх жыў У. Караткевіч, яго творы, жанры, у якіх працаваў пісьменнік, літаратурныя крытыкі, літаратуразнаўцы, якія пісалі пра прозу, паэзію, драматургію класіка, мастакі, якія ўвасобілі яго вобраз у сваіх карцінах, скульптурах, графічных работах… Усё гэта стане прадметам грунтоўнага і разам з тым па-энцыклапедычнаму лаканічнага разгляду ў новым творчым праекце, які павінен пабачыць свет у 2020 годзе.

**Мікола БЕРЛЕЖ**

## Валянціна Локун: паказальнік зробленага

Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага падрыхтавала да выдання біябібліяграфічны паказальнік, прысвечаны творчасці літаратурнага крытыка Валянціны Іванаўны Локун (1946—2016).

Гэтага дзейснага, працавітага даследчыка сучаснага літаратурнага працэсу ў Беларусі добра ведалі чытачы «Літаратуры і мастацтва», часопісаў «Полымя», «Роднае слова» і «Нёман» на працягу многіх дзесяцігоддзяў. Пачаўшы выступаць у друку ў 1973 годзе, калі ёй было ўжо амаль трыццаць гадоў, Валянціна Іванаўна паспела зрабіць неймаверна шмат у літаратурнай крытыцы, беларускім літаратуразнаўстве. Абараніла кандыдацкую дысертацыю «Праблемы стылю беларускай ваеннай прозы (на матэрыяле творчасці В. Быкава, Б. Сачанкі, І. Чыгрынава)». У 1998 годзе была прынята ў Саюз беларускіх пісьменнікаў (з 2006 — член Саюза пісьменнікаў Беларусі).

Зусім не выпадковым падаецца тое, што першыя артыкулы В. Локун былі прысвечаны людзям з няпростай біяграфіяй у частцы драматычных выпрабаванняў — Юліусу Фучыку, Мікалаю Астроўскаму, Уладзіславу Цітову. Сапраўды трывалае плячо пачынаючаму крытыку ў свой час падставіла мясцовая газета «Полесская правда». З канца 1970-х гадоў В. Локун друкуецца з рэцэнзіямі і артыкуламі ў «Літаратуры і мастацтве», «Нёмане», «Полымі». Паказальнік, дбайна ўкладзены супрацоўніцай Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага В. Гарбачэўскай, уражвае сваёй грунтоўнасцю. Выданне — красамоўны расповед пра зробленае, здзейсненае Валянцінай Іванаўнай Локун. Чалавек ціхі, някідкі трывалацю свайго лёсу, памкненнямі змагання за жыццё (з юных гадоў яна хварэла міяпатыяй, якая паступова давяла да атрафіравання мышцаў), сумленнай працай у беларускім літаратуразнаўстве заслугоўвае таго, каб адна з вуліц прыгожага і любімага ёй Пінска насіла яе імя. А паказальніку як пажаданне ў дарогу — хутчэй пабачыць свет, хутчэй знайсці свайго чытача.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА**




# «Я ўся — Радзіма...»

## Мастацкае асэнсаванне рэалій малой радзімы ў зборніку паэзіі Людмілы Кебіч

Творца — асоба ўражлівая, здольная ў паўсядзённым заўважыць дзівоснае, незвычайнае. Натхненне паэта пераасэнсоўвае ўсё, што бачыць навокал. Для мастака слова мае першаснае значэнне: гэта не нешта павярхоўнае, а глыбіннае, сакральнае, пранікненнае ў сутнасць штодзённай існасці. І па-над усім — Радзіма ва ўсёй складанасці і шматграннасці свайго праяўлення.

Розныя аспекты мастацкай тэматыкі зборніка Л. А. Кебіч «Бэзавы дом» (2018) не ізаляваныя адзін ад аднаго. Кніга падзяляецца на пяць вялікіх цыклаў: «З Краснасельскіх крыніц», «Вясковая сімфонія», «Лепшы горад Зямлі», «Беларусь — маё нахненне», «Вершы з дарогі». Тэматычны абсяг раздзелаў падобны да колазвароту жыцця: родны пасёлак — бабуліна вёска — родны Гродна — краіна Беларусь — вяртанне на радзіму з далёкіх вандровак. Перад чытачом паўстае шматпланавая карціна жыцця лірычнай гераіні, якая з пазіцый назапашанага духоўнага досведу асэнсоўвае ўласны пройдзены шлях, лёс роднага краю і яго люду.

Паэтка спасцігае радзіму як сусвет прыгажосці, радасці, натхнення. Перад позіркам чытача праносяцца шматлікія існасныя ўніверсаліі: родная хата, краявіды, бацькі, беларуская мова (мова жыхароў гэтай зямлі) і інш. Ва ўсім знаходзяцца сэнсава ёмістыя дэталі, напоўненыя незвычайнымі фарбамі.

*Там, сярод густых лясоў яловых,*
*дзе спакон жылі мае дзяды,*
*я адчула спеўнасць роднай мовы,*
*палюбіла край свой назаўжды.*

Эстэтычна ўзвышанымі становяцца многія рэаліі. Лірычнае перажыванне гераіні нараджаецца з жыццёвых эмоцый, перажытых аўтаркай, — гэта вынік мастацкага пераўтварэння ранейшых выпрабаванняў, папярэдняга досведу. Рэаліі адлюстроўваюць пэўныя душэўныя станы: замілавання, суму, журботы, радасці. Ім спрыяюць навакольныя краявіды малой і вялікай радзімы. Некаторыя вершы прысвечаны акрэсленым вёскам і мястэчкам — «Гудзевічы», «У Дзяцелаўцах», «Каля вёскі Тэалін», а таксама іншым геаграфічным аб'ектам, якія падымаюць з глыбіняў памяці ранейшыя падзеі і даўнішнія вобразы — «Краснасельская кар'еры», «Над Ваўкавыяй», «На Верасоўцы», «Над Швейцарскай далінай». Чытач пакрокава пранікаецца радзімай паэткі, бачыць яе шчырую любоў да беларускага краю. Родная старонка ўяўляецца аўтарцы як нешта цэльнае, дадзенае Богам для жыцця, для шляху з маленства з нейкай місіяй. Праз радкі вершаў акрэсліваюцца вобразы дарагіх дзядулі і бабулі, таты і мамы, асобаў, хто паўплываў на станаўленне светапогляду, хто ў розныя перыяды вёў па жыцці. Блізкія людзі яшчэ асацыююцца з нацыянальнай асновай, з роднай беларускай мовай, традыцыямі, побытам. Нездарма паэтэса сцвярджае ў вершы пра маленства «Хачу туды»:

*Хачу туды:*
*дзе бабуля і дзед — жывыя,*
*і мой тата і мама — жывыя,*
*і ўсе працай нейкай занятыя,*
*а здаецца, у доме — свята.*

Вершы зборніка «Бэзавы дом» кладуцца ў канцэпцыю еднасці лірычнай гераіні і той зямлі, што яе нарадзіла і вырасціла, зямлі з яе гісторыяй і культурай. Так, у вершы «Дарагі куточак» яскрава прасочваецца ланцужок універсалій: «куточак» — «родная мова» — «мае дзяды» — «нацыя свабодных беларусаў». Усё гэта знаходзіцца «там, дзе рэчка Рось пятляе крута», у Ваўкавыскім раёне. Лірычная гераіня — асоба цяперашняга часу, але яна не страціла повязь з мінулым і добра разумее каштоўнасць традыцый папярэдніх пакаленняў продкаў. Грамадзянскія матывы не навязлівыя, яны падаюцца ва ўтульна мяккай форме вобразаў дзяцінства і маладосці, даросласці і сталасці, праходзяць праз краявіды і пачуцці.

Шырокая панарама пачуццяў і адчуванняў узнікае ад вуліц, паркаў і гістарычных мясцін Гродна, ракі Нёман (вершы «На травеньскіх вуліцах Гродна», «Прывакзальная плошча», «Гарадзенскія салаўі», «На Замкавай гары», «Каложскі парк», «Песні над Нёманам» і інш.):

*Сябе на думцы зноў і зноў лаўлю,*
*што з'ехаць аніколі не збяруся,*
*бо толькі Гродна ўсёй душой люблю —*
*куточак унікальны Беларусі.*

На фоне глыбока пачуццёвых вершаў паэтка пакідае запавет сваім нашчадкам. У вершы «Скажыце мне» прасочваецца ў канцэнтраваным выглядзе ідэйна-філасофская канцэпцыя зборніка — місія любога грамадзяніна служыць свайму народу, зберагчы родны край і перадаць у спадчыну нашчадкам:

*Скажыце мне, што Беларусь не згіне*
*ад войнаў, ад пажараў, ад вады...*
*І я спакойна гэты свет пакіну,*
*закрыю вочы ціха назаўжды.*

Паэтычную думку абуджае пошум лісця, спевы птушак, дзіцячыя галасы. Усё блізкае, роднае, душэўнае. Шчымліва дрыжыць сэрца, хвалюючы пульсуе ў скронях кроў, пачуцці хваляю накрываюць... Радзіма вечная! Яе праявы ў гуках, фарбах, формах архітэктурных пабудоў, якія стварыў люд беларускі, продкі, «святыя дзяды».

Вершы зборніка «Бэзавы дом» у многім біяграфічныя. Факты з жыцця перайначваюцца праз паэтычны погляд жанчыны-творцы. Яна і ўнучка, і дачка, і ўжо маці, і бабуля. А яшчэ і беларуска, якая хварэе за свой народ і зямлю. Сацыяльныя працэсы і лёс лірычнай гераіні крочаць побач.

Лірычная гераіня паэзіі Людмілы Кебіч жыве традыцыямі народнай маралі, яе ўнутраны свет стаіць на падмурку каштоўнасцяў беларускага нацыянальнага светаўспрымання. Як музыкант, Людміла Антонаўна тонка адчувае мелодыку і паэтыку народнай песні і з лёгкасцю пад яе стылізуе ў настраёвасці старажытнага гусляра, апяваючы спрадвечную сілу беларусаў і прагу да свабоды, незалежнасці на складаных перакрыжаваннях гісторыі:

*Ці ж з крыніцы волі нам больш не піці?!*
*Дзе ж асілкі-волаты ваша сіла?*
*У бядзе забраны край —*
*ой не спіце!*

Многія вобразы ў лірыцы Людмілы Кебіч набываюць сімвалічны сэнс, шматзначнасць. Блізкасць да нацыянальных традыцый — адна з ідэйна-сэнсавых дамінант вершаў, якія так, бывае, і называюцца «На Каляды», «Вялікдзень», «Дажынкі». Перад чытачом ненавязліва паўстае пласт народнай культуры на побытавым узроўні, з пункту гледжання простага чалавека, але пры гэтым у высокаэстэтычным асвятленні. Так, у вершы «Дажынкі» ў адзін сэнсавы шэраг аўтарка ставіць «людзей пачэснай працы» і «светлы лёс Айчыны», звязваючы іх непадзельнай асацыятыўнай сувяззю ўзаемазалежнай еднасці. Адчувальна суладдзе душы паэткі і беларускага народа, Радзімы. Паэтычная думка рухаецца ад мясцовага (вясковага, гарадскога) да глабальнага, агульнанацыянальнага, а пасля зноў вяртаецца назад.

Рэаліі роднага краю асэнсоўваюцца ў шчыльнай лучнасці з мінулым, сучасным і будучыняй у эстэтычна ўзвышаных фарбах экспрэсіўных пераходаў ад блізкага да далёкага і назад, вяртаючыся да сябе. Прадмову да зборніка Людміла Антонаўна заканчвае радкамі з паэтычнай фармулёўкай творчага крэда, якім кіруецца ў сваёй паэзіі:

*Я ўся — Радзіма.*
*З ёю знітавана.*
*Адною ёю дыхаю, жыву.*
*І ўсё, што бачу навокал, як дзіва,*
*ўплятаю ў вершаў спеўную канву.*

**Руслан КАЗЛОЎСКІ**

# Паляванне на ўяўленне




Што новага можна сказаць у жанры сучаснай фантастыкі? Ці чым мусіць здзівіць аўтар, здавалася б, у немагчымай да немагчымасці (даруйце за таўталогію) культуры ўяўлення пасля Говарда, Лаўкрафта, Толкіна, Перумава, Марціна, Лема, Саймака, Хайнлайна, Нортан, Жалязнага, Сямёнавай і безлічы іншых фантастаў, імя якім — легіён, і застацца арыгінальным?.. Прасцей простага, калі задумацца, сесці і пісаць, аддаўшыся на волю фантазіі і ствараючы ўласныя сусветы, поўныя незвычайных прыгод, чараўніцтва, гераізму, нават апакаліпсіса. Аднак, нягледзячы на сумніўную свабоду мыслення, жанр фантастыкі, асабліва фэнтэзі — найбольш кананічны і жорсткі ў сваіх правілах, амаль як класічнага ўзору п'есы. На шчасце, беларускай літаратуры гэта амаль не датычыцца, бо яна з суперпапулярным ва ўсім свеце жанрам пакуль знаходзіцца ў стасунках цукерачна-кветкавага перыяду (маюцца на ўвазе выключна беларускамоўныя творы) — яны ў большасці нагадваюць вучнёўскія спробы пяра. Чытаць іх будуць хіба што ад фанатычнай адданасці жанру, дзеля якога спажывеш што заўгодна, бо сядзіш на ім як на гераіне.

Таму без асаблівай на тое ахвоты ўзяў новы зборнік фантастычных апавяданняў і аповесці Алеся Бычкоўскага «Дабрадзей і гармідар квантавай літаратуры», што быў выдадзены «Галіяфамі» напрыканцы мінулага года, раззлаваны да таго ж яшчэ і прэтэнцыёзнай назвай кнігі, паяднанай з аднайменным апавяданнем, што яе, між іншым, і адкрывае.

На дзіва, спадабалася. Не без хібаў, пад уплывам вышэйзгаданага Жалязнага і яго «Хронік Амбера», аўтар будуе забаўляльны квантавы парк з персанажаў сусветнай фантастыкі на глебе ўласна беларускай свядомасці. Сціпленька, але з густам. Аднак мы ж яшчэ на самым пачатку эвалюцыйнага шляху ў жанры, усё яшчэ наперадзе…

Ды з фантастыкі ў кнізе, бадай, гэта адзіны паўнавартасны твор. Астатнія… хутчэй нагадваюць аповеды такога сабе сучаснага шляхціча Завальні, у асобе якога выступае шаноўны аўтар. Мушу адзначыць, чаму, уласна, фантастыкай іх назваць цяжка, бо не ўсё тое фантастыка, што падаецца фантастычным і неверагодным. Па аналогіі не ўсё тое, што блішчыць, мы называем шоўкам, ці не так?

Астатнія творы А. Бычкоўскага (іх, дарэчы, тры; кніга невялікая і чытаецца, між іншым, на адным дыханні) паяднаны між сабой (хаця абсалютна самастойныя адзінкі) казачнымі паданнямі і легендамі, на аснове якіх, уласна, і вырастае аповед. Нешта падобнае ў беларускай літаратуры ўжо было і ёсць, вядома, не ўлічваючы Баршчэўскага, праўда ж? І гэта… Людміла Рублеўская! Зрэшты, спадарыня Людміла Рублеўская ў сваіх творах абвяргае ўвесь той містычны і фантастычны флёр, якім намагаецца прыкрыцца аб'ект яе даследавання, і знаходзіць навуковае абгрунтаванне, здавалася б, невытлумачальных падзей. Аўтар «Дабрадзеяў і гармідару…», наадварот, навуку адпрэчвае цалкам і настойвае на прысутнасці звышнатуральных сіл і з'яў у прыродзе. Больш за тое, у жыцці адмыслова народжаных дзеля выпрабоўвання тых сіл людзей. Відавочнае падабенства пабудовы сюжэтаў у Рублеўскай і Бычкоўскага, зрэшты, аніяк не сказваецца ні на якасці іх твораў, ні на арыгінальнасці творчасці абодвух — у кожнага свае мэты.

Творы А. Бычкоўскага вельмі кінематаграфічныя, што, між іншым, адна з галоўных уласцівасцяў жанру, у якім працуе аўтар, прычым з прэтэнзіяй на галівудскі маштаб, што не дрэнна, але і не без уплыву слыннай фабрыкі мрой. Напрыклад, узяць яго апавяданне «Паляванне на ваўкалака»… Міжволі, пасля прачытання, узнікае асацыяцыя з Джэкам Нікалсанам і фільмам «Воўк», хаця нічога агульнага, калі задумацца, у творах няма. Але асацыяцыя ёсць. Сэнс апавядання ў чым? У тым, што ваўкалакі жывуць сярод нас, што яны нашчадкі зніклай, як атланты, культуры, неўраў, хоць і прыходзяць з іншых вымярэнняў, якіх безліч, і адным з іх быў вялікі беларускі князь Усяслаў Чарадзей. З ніадкуль показкі не бяруцца, сцвярджае аўтар. Вядома, іх прыдумвае ці, хутчэй, дадумвае народ, але на аснове сапраўдных падзей. Ваўкалак у творы А. Бычкоўскага — зніклы бацька галоўнай гераіні, выкладчыцы гісторыі, з артыкула якой пра ваўкалака і пачынаецца аповед — падчас наступстваў выбуху на Чарнобыльскай АЭС. На жаль, аўтар не тлумачыць, дзе ён прападаў столькі гадоў, а калі з'явіўся ў горадзе — чаму адразу пачаў навадзіць парадак з імпэтам супергерояў, распраўляючыся з нягоднікамі, высочваючы іх, каб абараніць сваю дачку. Падобным жа чынам высачылі і яго, ды забілі проста на вачах у дачкі, якая, зразумела, не здагадвалася пра сваяцтва з пачварай да моманту смерці апошняй, калі тая пераўтварылася ў чалавека. Вось такую ўдзячнасць, можна сказаць, атрымаў ваўкалак за жаданне памагчы людзям...

У аповесці «Блукач» героям пашанцавала больш, нягледзячы на тое, што з іншымі вымярэннямі яны сутыкнуліся папросту лоб у лоб. Самае цікавае: надзвычайная мясціна цярпліва чакала шмат гадоў галоўнага героя, каб у вобразе жабы паведаміць страшэнную тайну крыжа святога Філімона, дзякуючы якому і існуе магчымасць блукаць па іншых вымярэннях ды ахоўваць іх ад блукачоў-ліхадзеяў.

Найбольш вартасным, якасным, па-майстэрску выпісаным да драбніц і глыбіні паглыблення ў прапанаваныя абставіны, на маю думку, з'яўляецца апавяданне «Дом, які здзяйсняе жаданні». З фантастыкай як такой, на жаль ці, наадварот, на шчасце, твор не мае нічога агульнага. Гэта хутчэй псіхалагічны трылер, пабудаваны на гісторыі праклятага дома з крывавым мінулым і дзяўчыны, на свядомасць якой ён уздзейнічае, у найлепшых традыцыях Стывена Кінга. Зрэшты, параўнанне тут адно для прыгожага слова. Апавяданне сапраўды ўражвае і надоўга асядае ў спратах памяці як нешта трывожнае, што хочацца распавесці камусьці яшчэ і пачуць пра тое супакойлівую думку.

Такім чынам, у цэлым новая кніга А. Бычкоўскага неблагая, адметная, у першую чаргу, неказённай, сакавітай, вобразнай, жывой беларускай мовай, што, на жаль, рэдкасць сярод твораў сучасных беларускіх пісьменнікаў. Аўтар — майстар сюжэта, і ад яго хацелася б крышку большага, не проста апавяданняў, нягледзячы на тое, што іх пісаць цяжэй за ўсё, а вялікага рамана, бо і жанр патрабуе гэтага, і, думаю, чытачы і прыхільнікі яго творчасці.

**Мікола АДАМ**

Святлана БЕЛЬСКАЯ



## Возера Нарач

**Легенда**

*Гамоніць возера Нарач,
Спяшае ў бязмежныя далі.
— Раскажы мне, возера Нарач,
А чаму цябе так назвалі?*

*Заблішчэлі азёрныя хвалі,
Як дзявочыя сінія вочы.
— Нездарма мяне так назвалі,
Раскажу, калі ведаць хочаш.*

*У краі белых бяроз і ажынаў
Хлопец жыў, працавіты і гожы.
Пакахаў ён аднойчы дзяўчыну,
А дзяўчына была непрыгожай.*

*Дык завошта тады так адчайна
Пакахаў яе хлопец? За тое,
Што была дабрыні незвычайнай,
Сэрца мела яна залатое.*

*Але хлопец чуў злыя кпіны:
"Ці ж вачэй ты, скажы, не маеш,
Што каханай сваёй, адзінай
Недарэку ты называеш?"*

*Захлынулася жальбай такою
Сэрца хлопца, што песня суму
Палілася чорнай ракою,
Як і хлопца чорныя думы.*

*І дзяўчыне цяжка і горка,
Хоць кахае хлопца аддана.
Злыя словы каменнем з узгорка
На сардэчную падаюць рану.*

*Раз пачуў яе плач адчайны
Чарадзей міласэрны вандроўны.
Ён люстэрка ёй даў незвычайнае,
Што валодала сілай чароўнай.*

*Падарунак дастала з куфэрка
Дзяўчына раніцай роснай.
Паглядзелася ў дзіва-люстэрка —
Прыгажуняю стала дзівоснай.*

*Разышліся цёмныя хмары.
Птушак спевы вакол разліліся.
Дзяўчыны і хлопца мары,
Здавалася, урэшце збыліся.*

*Ды нядоўгім шчасце было іх.
Князь убачыў красу дзяўчыну
І забраў у свае пакоі,
Дзе дурманіла пахам шыпшына.*

*А дзяўчыне сумна і горка,
Навошта палац ёй, убраны
Пазалотаю, быццам зорка,
Калі разлучылі з каханым.*

*Навошта ёй кветкі шыпшыны,
Што пахам дурманяць на золку.
Шпурнула люстэрка дзяўчына —
Пырснула безліч асколкаў.*

*І не стала княжага замка,
Што майстры з-за мяжы будавалі.
На тым месцы сонечным ранкам
Зашумелі азёрныя хвалі.*

*...Гамоніць возера Нарач,
Спяшае ў бязмежныя далі.
— Нарачоная хлопца... Нарач.
Вось чаму мяне так назвалі.*

*Дабрыню як дар найвышэйшы
Людзі з даўніх часоў праслаўлялі.
Хочаш стаць душой прыгажэйшым,
Паглядзіся ў азёрныя хвалі.*

## Хмара

*Алавяная хмара дрыготная
Сонца сабой закрывала.
Нібыта Сірын, самотна
Песню тугі спявала.*

*Распасцёршы доўгія крылы,
Цямнела на небе плямай.
Калматай, вялікай, застылай,
Чорнай фарбай намаляванай.*

*Ды вецер вандроўны раптам
Дыхнуў. І ў адно імгненне
Стрэламі вельмі трапнымі
Пырснулі сонца праменні.*

*Кульнулася хмара бокам,
Паплыла да шумнага гаю,
Каб не чуць, як у небе высокім
Песню радасці сонца спявае.*

---

Дзмітрый РУБІН



## «П'яўка таксама рыба»

***

*У пустым пакоі
Толькі ты і я
І сонца
Вогненна-сіняе
Халодзіць і грэе
Сваімі склізкімі шурпатымі языкамі
Па скуры
Пад скурай
Праз скуру
У пустым пакоі
Толькі ты і я
І паветра
Салодкае і празрыстае
Вільгоціць вочы
Сушыць вусны
Абдымае маімі рукамі цябе
А мяне тваімі
Рукамі
У пустым пакоі
Толькі ты і я
І неба
Разарванае дахамі
Абарванае даляглядамі
Вырванае з коранем
У пустым пакоі
Толькі ты і я
І за межамі пустога пакоя
Толькі ты і я
І за межамі нас
Толькі пусты пакой*

***

*Усё гарыць
Узмах крыламі матылька
Не тушыць пажар
Жар раз'ядае яго
Узм-
Ах агонь
Бяжыць да вады
Каб патануць
Усе завуць да сябе не даюць
Яму бегчы
Узм-
Ах агонь ловіць сачком матылька
А сачок у прапалінах
Прапалі-нах
Вашы сляды на костках жывых
Вашы дамы с-
Ценамі на ценях
Пятамі ў каранях
Рукамі ў грудзёх
Узм-
Ах а гоніць агонь час
(Гэ)та мастацтва паспець за часам я не
Паспяваю
Я пас
Уз-
Мах кры-
Ламі матылька
Не затухае*

*Гэта рака
Гэта мора
Вот мора да мора
Скора-скора хутчэй
Скарэй
Зкарэй
Згарэй
Акрамя магілы
Якая дакладна ма-
Я
Ма-
Я*

***

*Іранічна
Крычаць
З разарваным горлам
Гукі дзеляцца
Ствараюць самую жывую
Музыку
Руйнуюць
Апошнія сцены
Чужога свету
Затыкай пальцамі
Прабітыя дзіркі
Накрывай выразаную магілу
Рота
Дзьмі
Я не ўтрымаюся і
Пацалую*

***

*Лісты бярозы павінны былі
Існі вайной на асіну
Лісты асіны павінны былі
Існі вайной на бярозу
Але і тыя і тыя
Ляжаць дываном
Ля свайго дому*

***

*Эвалюцыя завершана
Я выйшаў на сушу
Толькі вярнуцца назад
Ужо немагчыма
Плаўнікі слабыя
Цела цяжкое
А яшчэ гэтыя дробныя
Тыкаюць палкай у вочы
У іх ужо ёсць палка
А я толькі выйшаў на сушу
Але вось аднапчу і стану
Такім як яны чалавечным*

***

*Чорны нос
Белага мядзведзя
Шайбай на льдзіне
Чырвоныя плямы
На белым снезе
Выводзяць новыя словы
Новыя малюнкі
Складваюць вечнасць
Костачкамі Кая
Сіняе неба
За белымі аблокамі
Не схаваецца*

***

*Гляджу на далягляд
Дзе мора
Якое ніколі не любіла мяне
Дзе тапельцы
Якія машуць мне рукамі
І маўчаць
І іх рукі маўчаць
І далягляд маўчыць
І я маўчу
Спрабую палюбіць гэта мора
Якое ніколі не палюбіць мяне*

---

Галіна АТРОШЧАНКА



## Ваенная вясна

Прысвячаецца Паўлюку Пранузу, франтавіку, земляку, паэту

*Ад ветру гнецца тугі колас,
Птушыны хор вакол звініць.
Вясна спявае ва ўвесь голас,
І не парвецца жыцця ніць!*

*І лашчыць хлопца сёння сонца,
А над акопам чмель гудзе.
Жаўрук спявае тут бясконца,
Прырода грае на дудзе.*

*І льюцца на паперу словы,
Нібыта не было вайны…
Пяшчоту дорыць вершык новы,
Ляціць на крылах ён вясны.*

*Вось кулямёты грымяць справа,
Снарады рвуцца побач зноў…
Салдату не патрэбна слава,
А толькі воля, мір, любоў!*

## Дзяўчатам сорак першага...

*Ты чыя, скажы, нявеста?
Бо заўжды адна, адна…
Не прыішле каханы вестак,
Хоць чакаеш ля акна.*

*Не падорыць ён рамонкі
І маністы з тых рабін,
Дзе спявала лета звонка,
Бо сюжэт вайны адзін!*

*Песня гэта не дапета,
А юнак жыццё любіў!
Як раней, спявае лета
Сярод гаю, каля ніў.*

*Адляцеў ён незваротна,
Мілы сябар, дзе ты? Дзе?
І нявестаю самотнай
Па жыцці дзяўчо ідзе...*

## Самотны дзень

Памяці Эмы Васільеўны Усціновіч, пісьменніцы

*Тут не чуем спеў птушыны,
Шэрым будзе далягляд…
І на новыя сцяжыны
Запрашае лістапад.*

*Адгукнуцца гулка крокі,
Дзень знікае за мяжой.
Як вандроўнік адзінокі,
Кружыць ліст над галавой.*

*Пажаўцелі ўсе травінкі,
А навокал — цішыня.
На крыжах трымцяць расінкі,
Ад якіх — журба адна.*

*Вершы чулі тут дубровы,
Слёзы капалі з вачэй.
І ляцелі ў неба словы,
Каб душы было лягчэй…*

## Матулі

*Па галінках скача вецер,
Ліст апошні ападзе.
У дажджлівы, цёмны вечар
Зноў цяпла няма нідзе.*

*Дождждык стукае ў акенца,
Вецер вішаньку трасе.
І цішком сумуе сэрца:
Як даўно няма цябе...*



Георгій МАРЧУК

# Святы майго юнацтва

## ВЯЛІКДЗЕНЬ

Калісьці свята Кастрычніцкай Рэвалюцыі было найважнейшым дзяржаўным святам найперш для ўлад і служачых бюджэтных устаноў, а хрысціянскае свята Уваскрэсенне Ісуса Хрыста — Вялікдзень — галоўным святам царквы і простага люду. Вялікдзень святкуюць без прымусу і абавязкаў — па волі сэрца і веры.

Некалі нават у сем'ях камуністаў патаемна фарбавалі велікодныя яйкі і пяклі кулічы. Трэба адзначыць і тое, што ў Давыд-Гарадку ўлады ніколі не закрывалі царкву. Гэта гістарычны факт.

Святкуюць Вялікдзень вясной, калі заўсёды багата сонца. Ад гэтага цяпла блакітнага неба, першай зеляніны яшчэ больш радасці на сэрцы.

Да святкавання рыхтуюцца загадзя: прыбіраюць у хаце і вакол яе, вечарам пякуць кулічы і фарбуюць яйкі.

На наступны дзень жанчыны і дзеці нясуць прысмакі ў царкву, а мужчыны стаяць за агароджай і назіраюць, як святар абыходзіць і акрапляе кулічы і яйкі, людзей. Хочацца, каб святая вада далящела і да твайго твару.

Цэнтр горада людзі не пакідаюць, ніхто не спяшаецца дадому. Хрыстосваюцца са знаёмымі: тройчы цалуюцца. Мы, падлеткі, такой моды яшчэ не мелі. Дзяўчаты саромеюцца, назіраюць, як мы гуляем у біткі: б'ём яйкі, а калі шкарлупіна трэснула, трэба аддаць яйка таму, у каго яно цэлае. Мне не шанцавала, заўсёды прайграваў. Быў у нас адзін хлопец з Выгона (квартал у горадку), у яго была бітка, з якой шпрыцам выцягнуты жаўток і бялок, а ўнутр ён заліваў воск. І такое здаралася… Гэта быў падман не злосны, а жартаўлівы.

Самыя старыя людзі ў цэнтр не хадзілі, збіраліся на лаўцы каля якой-небудзь хаты. І мой дзед быў так час з сябрамі. Пераказвалі, хто што помніць, часам спрачаліся: каго яшчэ разам з Хрыстом распялі, блыталі імёны, прыгадвалі запаведзі.

На вуліцы мужчыны ніколі не пілі ні самагонкі, ні гарэлкі, ведалі, што дома жонка накрые стол і абавязкова нальле сто грамаў да смачнага абеду.

Вечарам мой дзед браў Евангелле і даказваў сваім сябрам, што правільна назваў разбойнікаў, якія пакутавалі разам з Хрыстом. Любіў, каб праўда была на яго баку.

Жанчыны таксама збіраліся разам, абмяркоўвалі службу ў царкве.

Шанавалі свята. Мой дзед ніколі вечарам не маліўся, а на Вялікдзень хрысціўся перад іконамі, чытаў малітву па-свойму: «Ойча наш». Гледзячы на яго, і я крыжаваў грудзі і лоб. Бабуля за гэта нас хваліла.

У гэты дзень танцаў у клубе не было. Мы з сябрамі яшчэ трохі шпацыравалі па цэнтральнай вуліцы і разыходзіліся. Яшчэ ад дзядоў нам застаўся своеасаблівы салют: запальвалі яловыя шышкі і кідалі іх угару. Было ў гэтым нешта таямнічае. Ад ветру шышкі свяціліся. Агеньчыкі ў цёмным небе зззялі, як вочкі анёлаў.

А ноччу мне не спалася. Абуджалі душу светлыя мары. Не хацелася развітвацца са шчымлівым і радасным Вялікаднем. Хацелася жыць і марыць.

## 1 МАЯ

Гляджу на стары здымак нашага адзінаццатага класа на першамайскай дэманстрацыі. Маладосць пазнаецца адразу: амаль у кожнага на твары ўсмешка, ад таго, што маладыя, што так хораша проста жыць і марыць пра будучыню. На жаль, не ўсё адбываецца. Ёсць на шляху нечаканасці, і часта непрыемныя. Гляджу з пяшчотным сумам. За гэтыя гады амаль палова класа няма ўжо на нашай зямлі. А так хацелася б, каб мы разам перагарнулі старонкі, на пяцьдзясят пяць гадоў назад.

Першамай — міжнароднае свята працоўных. У горадку на той час не было фабрык і заводаў. Таму адзначалі яго настаўнікі, дактары, работнікі культуры, прадстаўнікі мясцовых улад.

Збіраліся за гадзіну да пачатку шэсця. Класны кіраўнік адказваў за свой клас. Апраналіся па-святочнаму, мабыць, толькі дзяўчаты. Самае непрыемнае было, калі амаль прымусова прапаноўвалі несці які-небудзь транспарант. Да палкі быў прыбіты невялічкі круг, дзе на фоне яблыневай квецені напісана «1 Мая». Дзяўчаты неслі кветкі. Ад школы да цэнтра горада — паўтара кіламетра. Рухаліся калонай, кожны клас са сваім кіраўніком. І хоць у нас быў класным мужчына, дысцыпліны не назіралася. Падбівалі пад абцасы тых, што ішоў першым. Дзяўчат штурхалі ў бакі і шчыпалі за локці. Тады кіраўніцтва ўсёй калонай брала піянерважатая школы Нона Сямёнаўна. Яна не сварылася, а ветлівым тонам прасіла паводзіць сябе тактоўна. І мы яе слухаліся. Была яна вельмі мяккая, часам падменьвала хворага настаўніка. На яе ўроках не назіралася парушэнняў. Трэба дадаць, што Нона Сямёнаўна была з адной рукой, але ніколі не звяртала на гэта ўвагі. Цудоўна спявала. Мы разам спявалі з ёй песню «Ленінград» В. П. Салаўёва-Сядога. Спраўна атрымлівалася. Нават выклікалі «на біс».

У цэнтры горада калону ўзначальваў старшыня гарсавета са сваім суправаджэннем і духавы аркестр. Ішлі праз мост да стадыёна. Бадзёрыя маршы ўзнімалі настрой. На стадыёне слухалі дакладчыкаў пра свята 1 Мая і дасягненнях горада ў сацыялістычным спаборніцтве. Пасля ўрачыстай часткі людзі ішлі да крамак спажыўкааперацыі, куплялі дзецям цукеркі-падушачкі, сабе — каўбасу і піва. Усюды панаваў бадзёры настрой.

Мы класам трымаліся разам, фатаграфаваліся, а пасля — у цэнтр да сквера, дзе маглі ўжо без настаўнікаў адсвяткаваць Першамай па-дарослому, выпіўшы яблычнага віна.

Нона Сямёнаўна (яна жыла недалёка ад сквера) махаючы пальцам, сарамаціла нас. А мне асобна рабіла заўвагу: «Жора, не вучыся піць гэтую гадасць. Згубіш голас — як мы тады будзем спяваць?».

Нечакана аднакласніца Ларыса вымавіла: «Людзі, гэта ж наш апошні Першамай разам… Ці разумееце гэта?» І вочы набрынялі слязамі.

Добрае, цёплае свята з музыкай, з усмешкамі, з сонейкам…

«Запамінайце кожную хвіліну. Хто ведае, куды нас занясе лёс...» — казала Нона Сямёнаўна. Нехта ўзяў першы акорд, і ўсе падхапілі: «Сиреневый туман над нами проплывает…» А каля кінатэатра «Зара» духавы аркестр зайграў вальс. Дзяўчаты падхапілі хлопцаў і пачалі танцаваць. Доўга не разыходзіліся, а ўвечары зноў сабраліся ў клубе на танцах.

Пасля гэтага Першамая нашаму класу больш не давялося сабрацца на свята працоўных усяго свету.

Праз дзясяткі гадоў я атрымаў ліст ад Ноны Сямёнаўны, у якім яна нагадвала пра святы і запрашала наведаць радзіму. Ёй вельмі хацелася праспяваць нашу любімую песню В. П. Салаўёва-Сядога.

На жаль, калі ў мяне нарэшце атрымалася прыехаць, я спазніўся: памерла наша піянерважатая нечакана. Ішла па мосце, раптам упала... Так завяршыўся зямны лёс гэтай добрай і чулай жанчыны.

Так мы і не праспявалі нашу песню.

Шчымлівай хваляй накатвае ўспамін пра гэты светлы, добры, вясёлы Першамай з добрай усмешкай Ноны Сямёнаўны, якая любіла ўсіх і ўсе любілі яе.



Пятро РАМАНЕНКА

# Сустрэча

*Апавяданне*

На правым беразе Дняпра, каля мемарыяльнага каменя паблізу вёскі Крупейкі, стаялі двое: стары гадоў васьмідзесяці і хлопчык. Худы, маршчакаваты твар старога быў узлапочаны, рэдкія сівыя валасы кудлаціў вецер. Ён быў без адной нагі, абапіраўся на мыліцу і нешта распавядаў малому, які ўважліва слухаў. Я падышоў бліжэй і ўбачыў на грудзях ветэрана баявыя ўзнагароды. Ён быццам і не заўважаў мяне, працягваў гаварыць, пасля прысеў на ўзвышша каля старой траншэі, закурыў…

Раптам узварухнуўся, паправіў мыліцу, зірнуў уніз, нахіліўся і падняў аўтаматную гільзу.

— Столькі гадоў прайшло, а гэта ўсё ляжыць! Фашысты! Нелюдзі! — ветэран з размаху шпурнуў гільзу пад гару. Успаміны не давалі спакою…

…Па мёрзлай зямлі ішоў чалавек, згінаючыся пад цяжарам бервяна. Апрануты ён быў у выцвілую салдацкую форму. Відаць, на вайне ўжо не першы год. Задыханы, спыніўся, скінуў сваю ношу, сеў на бервяно, закурыў.

Уздоўж затокі ішлі людзі. Яны таксама неслі бярвенні. Неўзабаве да салдата падышоў сяржант.

— Што сядзіш, Мікола? — запытаў.

— Плячо намуляў, няхай яму ліха! Сядай, Валодзя, пакурым крыху.

Сяржант скінуў бервяно, сеў побач з Міколам і, зрабіўшы самакрутку, закурыў.

— Недалёка адсюль, за два кіламетры, украінская вёсачка Пазнапалы была. Я там хлопцам калісьці з дзяўчатамі гуляў, — паглыбіўся ва ўспаміны Мікола. — З людзьмі спалілі.

— Фашысты паганыя!..

— Я з гэтых мясцін, Валодзя. Там, за Дняпром, вёсачка мая, — Мікола ўздыхнуў. — Перапрaвімся, да мяне зойдзем, дзетак маіх пабачыш.

Прыгажун Дняпро, быццам узрадванае дзіця, якое сустракала сваіх бацькоў, узнімаў хвалі і шчодра біў імі аб бераг.

— Пачакай крыху, хутка вызвалім цябе, сынку, — шаптаў Мікола.

Нястрымна, бы хвалі, гойдалася і сэрца, адстукваючы хвіліны. Людзі ляжалі на падмёрзлай зямлі і чакалі загаду. Пачало віднець. Моцныя выбухі ўскалыхнулі наваколле. Шэрая дымавая паласа павісла над ракою і паволі, быццам туман, папаўзла ўздоўж Дняпра.

— Пара! — загадаў камандзір.

Людзі асцярожна ўзыходзілі на плыты, садзіліся ў лодкі, адплывалі.

— Асцярожней, браткі! Хутчэй грабіце! Там жа вёсачка мая… Сям'я мая там… — прасіў Мікола.

Дымавая завеса знікла, і цяпер ужо выразна прагядаўся бераг. Фашысты заўважылі байцоў і адкрылі агонь з усёй зброі, якая толькі ў іх была. Застракаталі кулямёты і аўтаматы, чутны былі і рэдкія стрэлы з вінтовак. Вялізны слуп вады ўзняўся побач, затым плыт пачаў распаўзацца па вадзе разам з людзьмі.

— Хутчэй, хлопцы, хутчэй, родныя!.. — паўтараў Мікола. — Вось-вось будзе мелка, яшчэ крышачку. Вось і добра, — ён шастом дастаў камяністае дно.

Хутка першы плыт упёрся ў бераг. Пачаўся рукапашны бой. Мікола бачыў, як пакідалі свае пазіцыі фашысты…

Байцы перабежкамі прабіраліся туды, дзе ў хваёвым лесе, на ўскраіне, віднеліся крыжы і маленькая капліца. Неўзабаве яны ўжо былі на месцы. Іх засталося ў жывых чалавек восем…

— Пачакаем цемры, — сказаў камбат. — Назад ісці нельга. Загад — толькі наперад!

Было чуваць, як недалёка рваліся снарады. Над вёскаю гарэла вогнішча.

— Рыхтуйцеся да бою, сынкі! — скамандаваў камбат.

Бразгнулі вінтоўкі, у месячным святле зазззялі штыкі. З гучным воклічам «Ура-а-а!» байцы кінуліся ў вёску. Першым бег Крупейчанка. У гэтай мешаніне фашысты адышлі на другую палову вёскі і там зрабілі абарону.

Міколу дагнаў сяржант:

— Зайздрю я табі, Мікола!.. Ріднэ село вызваляеш… Такэ раз у жыцці бувае…

— прамовіў ён, цяжка дыхаючы.

— Вось і правулак, і хата мая… Але дзе яна? — Мікола дрыжачымі рукамі сціснуў вінтоўку… Спыніўся, прайшоў па паваленым плятні ў гародчык. Замест хаты ён убачыў некалькі абгарэлых бярвенняў…

— Насця! — закрычаў Мікола, сэрца яго сціскалася. — Насця, Андрэй, Дунька, Алеся!

З яміны, у якой звычайна захоўвалі бульбу, вылез хлопчык у запэцканых лахманах. Мікола не адразу пазнаў яго.

— Татачка! Татачка! Даражэнькі мой! — заплаканы хлапец падбег да бацькі, абхапіў яго за ногі…

— Сынок! Сынок мой! — салдат абняў сына. — Мамка, Дунька, Алеся дзе?

— Мамку з Алесяй немцы забілі, — плакаў Андрэйка. — Дуньку ў Нямеччыну пагналі.

— Што ж гэта сунастаты робяць, сынок?

Мікола ўзяў на рукі сына, моцна прыціснуў да грудзей… Раптам прагучала аўтаматная чарга. Як падкошаны, ён упаў на зямлю каля вогнішча, што засталося ад хаты.

— Татка, родненькі! — закрычаў Андрэйка.

Моцны выбух ускалыхнуў наваколле: сяржант кінуў гранату туды, адкуль стрэліў фашыст…

…Ветэран дастаў з кішэні хустку, абцёр пот на скронях:

— Вось такая горкая доля твайго дзеда, Максімка. Ён быў у нас сынам палка, як цяпер гавораць. Мы з ім разам вайну скончылі, пад Кенігсбергам былі. З таго часу заўжды разам. А цяпер пахавалі яго на радзіме, дзе і прасіў. Зямля яму пухам. А вёсачка ягоная, Крупейкі, стаць ды прыгажэе. Жыццё пройдзе, ты генералам будзеш. Радзіму любіць трэба! Яна адзіная ў нас, другой ніколі не будзе!

# Ад песень ліцвінаў

## Карані Станіслава Манюшкі



Палац у Смілавічах.

**У фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі захоўваюцца беларускія і польскія выданні, што распавядаюць пра жыццё Станіслава Манюшкі ў Беларусі і Польшчы, яго дзейнасць у якасці кампазітара, дырыжора, педагога.**

Вядучае месца ў даследаванні творчай і эпісталярнай спадчыны славутага кампазітара належыць польскаму музыказнаўцу, педагогу Вітальду Рудзінскаму, манаграфія якога «*Stanisław Moniuszko. Studia i materiały. Cz.1.*» з'яўляецца літаратурна-мастацкім даследаваннем яго жыцця і дзейнасці і захоўваецца ў нашай кнігазборні.

У ліку аўтараў, якія распавядаюць пра творчасць Станіслава Манюшкі, найбольшай увагі заслугоўваюць польскія даследчыкі Здзіслаў Яхімецкі і Станіслаў Невядоўскі. Трэба адзначыць і выдадзены ў Пецярбургу ў 1900 г. біяграфічны нарыс Баляслава Вільчынскага, прысвечаны кампазітару. Цікавы і асобнік XIX ст. «Геаграфічны слоўнік Польскага Каралеўства», па якім можна прасачыць жыццёвы шлях творцы і прачытаць пра яго родныя мясціны. З гэтымі выданнямі таксама можна пазнаёміцца ў ЦНБ НАН Беларусі.

Манюшкі — старажытны шляхецкі род герба «Крыўда» ў Вялікім Княстве Літоўскім і Расійскай імперыі, у 1802 г. яго занеслі ў радаслоўную кнігу дваран Мінскай губерні. У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве г. Мінска ў фондах «Мінскі дваранскі дэпутацкі сход», «Мінскі галоўны суд» і «Ігуменскі земскі суд» захоўваюцца дакументы перыяду 1799—1916 гг. пра продкаў кампазітара. У іх утрымліваюцца спасылкі на тое, што заснавальнікам знакамітага роду быў Пятро Манюшка, які ў 1529 г. гаспадарыў у бацькоўскіх маёнтках і атрымаў ад польскага караля Сігізмунда Першага прывілей на дваранства і валоданне маёнткам Вялікія Манюшкі ў Ганёндзецкай парафіі (тэрыторыя сённяшняй Польшчы).

Бацька кампазітара Чэслаў у пачатку XIX ст. атрымаў у спадчыну ад бацькі фальварак Убель Ігуменскага павета. У гэтым мястэчку, за 9 кіламетраў ад Смілавіч, у сціплым драўляным доміку каля рэчкі Волма і нарадзіўся хлопчык, якому далі імя Станіслаў-Ян-Эдвард-Казімір.

Чэслаў Манюшка быў ндярэнны мастак і пакінуў пасля сябе 12 альбомаў з партрэтамі, пейзажамі, замалёўкамі вайсковых дзеянняў і сямейных вечароў. Творчыя стасункі звязвалі яго з мастакамі Валянцінам Ваньковічам і Янам Дамелем. З першым ён меў нават сумесную майстэрню ў Мінску. Але бацька кампазітара быў не вельмі дбайным гаспадаром. Неабачлівасць у выдатках, легкавернасць у грашовых справах прывялі яго да фінансавага краху. У 1842 г. фальварак перайшоў у іншыя рукі. Рэшту жыцця Чэслаў правёў у Радкаўшчыне.

Пані Эльжбета, нягледзячы на шматлікія цяжкасці, праз усё жыццё захавала моц і раўнавагу духу. Менавіта яна заўважыла іскрынку таленту ў сына, была першай настаўніцай Станіслава. Дарэчы, у гонар сваёй маці кампазітар пасля яе смерці напісаў «Жалобную імшу за душы памерлых».

Дзяцінства будучага кампазітара прайшло на ўлонні прыроды, сярод сялян. Хлопчык прагна слухаў песні, якія спявалі вяскоўцы. Гэтыя мелодыі адрозніваліся ад тых, якія іграла на фартэпіяна яго маці.

Каб даць сыну адукацыю, сямейства перабралася ў Мінск, дзе ўпершыню былі напісаныя вадэвілі, камічныя оперы і музычныя камедыі. Але спакойнае жыццё доўжылася нядоўга. Пасля паўстання 1831 г. бацьку па палітычных матывах звольнілі са службы. Манюшкі перабіраюцца ў Вільню, з якой шмат чаго было звязана ў жыцці кампазітара. Тут ён узяў шлюб з Аляксандрай Мюлер. Сям'я жыла на вуліцах Нямецкай і Вострабрамскай. У Вільні нарадзіліся тры яго сыны. Каб пракарміць сям'ю, Манюшка даваў прыватныя ўрокі, іграў у касцёле святога Яна на аргане. І пісаў музыку… Напрыклад, знакамітую «Латарэю», якую ў 1843 г. з поспехам паставіла ў Мінску вандроўная трупа немца Шміткопфа.



«Паходная песня ліцвінаў» С. Манюшкі (з нотамі), змешчаная ў аповесці У. Сыракомлі «Дачка Пястаў».

Падчас жыцця ў Вільні, а потым у Варшаве, кампазітар часта прыязджаў у Мінск, каб пагасцяваць у свайго сябра Дуніна-Марцінкевіча, пабачыць бацьку і сваякоў. Асабліва памятны быў для Манюшкі прыезд у 1856 г., калі тут праходзілі шляхецкія выбары. У гонар кампазітара адбылася вечарына, на якой прысутнічалі артысты і літаратары. У адну з паездак Манюшка пабываў у Каралішчавічах, непадалёк ад Мінска. Потым ён з захапленнем пісаў пра гэтае падарожжа. Апошні раз завітаў у Мінск у 1864 г., калі быў ужо вядомым і прызнаным кампазітарам.

Фонды аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі захоўваюць некалькі кніг, якія выйшлі пры жыцці вялікага кампазітара ў віленскіх друкарнях сярэдзіны XIX ст. Сярод іх — вельмі каштоўнае выданне Уладзіслава Сыракомлі «Дачка Пястаў» (1855 г.), дзе змешчаны



Станіслаў ва Убелі. Малюнак Чэслава Манюшкі.

музычны твор Станіслава Манюшкі «Паходная песня ліцвінаў». На пажоўклым ад часу аркушы мудрагеліста ўплецены ў арнамент назва песні на словы Уладзіслава Сыракомлі. Сярод нот для голасу і суправаджэння размешчаны словы гэтай песні. «Паходная песня ліцвінаў» — адзін з варыянтаў арыгінальнай старадаўняй песні, якая пераносіць нас у далёкія часы. Весела шуміць лес, ліцвіны выступілі ў паход, спяваюць бадзёрую песню пра свае подзвігі. Заўтра будзе бой. Каб толькі коні не падвялі і стаялі смела! У добры час…

Сярод іншых музычных твораў з прыжыццёвых выданняў кампазітара, выдадзеных у Вільні, — нотны запіс песні «Вясковы лірнік» на верш Уладзіслава Сыракомлі З гэтым вершам кампазітар мог пазнаёміцца яшчэ вясною 1852 года, калі Сыракомля прыязджаў з арандаванага ім прынёманскага фальварка Залуча ў Вільню і спыняўся ў доме Мілера, цесця Манюшкі, каб працягваць працу над тэкстам кантаты «Год у песні». Час магчымага напісання музыкі да «Вясковага лірніка» польскі музыказнавец Эрвін Навачык абазначае межамі ад узнікнення верша ў 1852 г. да першага выканання песні ў 1857 г. Аднак магчыма, што «Вясковага лірніка» Манюшка напісаў менавіта ў 1857 г. Сучаснік кампазітара Ежы Ляскарыс у сваіх нататках, змешчаных у «Тэцэ Віленьскай», прыгадвае, што Манюшка ў 1857 г. шмат увагі ўдзяляў перапрацоўцы оперы «Галька» і акрамя гэтага напісаў яшчэ некалькі твораў. Першым з іх названа «Лірнік». Нотны запіс песні С. Манюшкі змяшчае аўтограф Сыракомлі і подпісы блізкіх паэту людзей, што робіць гэтае выданне вельмі каштоўным. Пад вершам-прысвячэннем услед за Сыракомлем падпісаліся Баляслаў Навінскі (акцёр Віленскага тэатра), Мікалай Акялевіч (вядомы літоўскі пісьменнік), Эміль Дэрынг (акцёр Віленскага тэатра) і інш. Калектыўны подпіс пад вершам Сыракомлі ў зборніку Манюшкі замыкае Паўліна Кандратовіч, жонка паэта.

У ЦНБ НАН Беларусі праходзілі мерапрыемствы па ўшанаванні памяці Станіслава Манюшкі: ладзіліся выстаўкі да юбілейных дат, дэманстраваліся прыжыццёвыя выданні кампазітара ў гонар візіту ў бібліятэку яго праправрнучкі, прафесара Парыжскай кансерваторыі, прэзідэнта Асацыяцыі імя Станіслава Манюшкі спадарыні Клары Манюшкі, якая дзесяць гадоў таму ўпершыню прыехала на радзіму свайго прапрадзеда.

**Алена ДЗЕНІСЕНКА**



# «Хата бабкі Параскі» пераехала

## З прыватнай калекцыяй, што была сабраная ў вёсцы Цінкаўцы, цяпер знаёміцца ў бібліятэцы

У маленькім пакойчыку — некалькі стэлажоў з кнігамі, фотаздымкамі і дакументамі; круглы стол з друкавальнай машынкай; старая лаўка, карціны, розныя прадметы побыту. Усё гэта Сяргей Панізнік збіраў і захоўваў на сваёй сядзібе ў в. Цінкаўцы, вядомай як «Хатка бабкі Параскі». Бабка Параска — рэальна існуючая жанчына, у сакавіку 1979 года Сяргей Сцяпанавіч купіў хату ў яе ўнука. Гэтаму будынку было прызначана стаць больш чым проста дачай. Хата ператварылася ў самабытны этнаграфічны музей, створаны адным чалавекам без чыёсьці дапамогі. Усё ў гэтым месцы насіла адбітак творчай натуры паэта: якар на сцяне, які, напэўна, быў знойдзены дзе-небудзь на беразе Дзвіны; конскія сківіцы, ровар на драўляных колах; ручнік-абярэг, які застаўся ад былой гаспадыні, і процьма кніг.

Першымі ўбачылі музейную экспазіцыю Сяргея Панізніка ў мясцовай бібліятэцы вучні Бігосаўскай школы, і адбылося гэта ў Міжнародны дзень роднай мовы. Была магчымасць аддаць даніну павагі беларускай мове, а таксама пазнаёміцца з жыццём і творчасцю вядомага паэта. Цікавае і павучальнае мерапрыемства для іх падрыхтавалі супрацоўнікі Бігосаўскай бібліятэкі-філіяла. Прысутнічалі на адкрыцці новай музейнай экспазіцыі і госці з Верхнядзвінска.

Музей сялянскага побыту ў вёсцы Цінкаўцы Верхнядзвінскага раёна, вядомы пад назвай «Хата бабкі Параскі», Сяргей Панізнік заснаваў у 1979 годзе. Гістарычна-пазнавальную і мастацкую каштоўнасць у ім мелі як сама хата, так і абсталяванне: печ, мэбля, дываны, ручнікі і шматлікія, часам экзатычныя, прадметы побыту і народнай творчасці (мянташкі, куфры, ночвы, кавальскія вырабы, посуд, ліхтары і нават рэшткі драўлянага веласіпеда). Усё гэта стварала непаўторную карціну з вясковага жыцця Друйска-Дрысенскага Падзвіння.

# Лебедзеўская «Спадчына»,

## альбо Магчымасці школьнага музея

Даўным-даўно, шмат тысяч год таму, на Маладзечаншчыне, якой тады, канечне, і ў паміне не было, сфарміравалася ледавіковае возера. Праз некаторы час на месцы вадаёма паўсталі гарадзішча і паселішча, а потым і мястэчка Лебедзева. Разам з паэтычнай назвай населены пункт атрымаў і выгаднае геаграфічнае размяшчэнне: праз яго праходзіў гандлёвы шлях з Менска на Крэва і Вільню, што дапамагала ладзіць у Лебедзеве шматтысячныя кірмашы. Не толькі гандляроў прыцягвала мястэчка, у розныя часы яго наведалі Міхал Агінскі, Ян Чачот, Францішак Багушэвіч, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Ігнат Буйніцкі, Браніслаў Тарашкевіч і шмат іншых дарагіх беларускай культуры асоб. Чым вабіла мястэчка наведвальнікаў, — сёння звычайны невялікі аграгарадок, — пабяцаў мне расказаць аўтар кнігі «Лебедзеўская сага», настаўнік гісторыі і адзін з заснавальнікаў унікальнага музея «Спадчына» на базе Лебедзеўскай сярэдняй школы — Антон Антонавіч Апанасевіч.

Трэба сказаць, выпраўляючыся на экскурсію, не чакала нічога выбітнага ад школьнага музея. Але маленькі пакойчык, што прытуліўся да аднаго з класаў, сапраўды здзівіў: уся прастора застаўлена, завешана экспанатамі розных эпох і часоў. Перад вачыма мікс гісторыі: тут вам і рэшткі маманта; і рэканструяваная гармата; і калекцыя дарэвалюцыйных падручнікаў па матэматыцы (якой, можа, і ў Нацыянальнай бібліятэцы няма); і балцкі меч часоў лебедзеўскага гарадзішча; і каштоўны медальён «Маці, якая корміць», створаны вядомым французскім майстрам Эмілем Дропсі, і колькі яшчэ ўсяго!

### ПРА ВУЧНЯЎ

Не паспяваю нават зразумець, дзе апынулася, як аднекуль з'яўляюцца вучні-экскурсаводы і шпарка расказваюць аб рэчах, што знайшлі прытулак у музеі. У Антона Антонавіча свая методыка падрыхтоўкі кадраў:

— У нас пятнаццаць экскурсаводаў. Я пачынаю даваць неабходныя веды да гэтай місіі з пачатковай школы, а ў адзінаццатым яны ў мяне ўжо амаль прафесіяналы. Акрамя гэтага, мы з вучнямі актыўна ўдзельнічаем у даследчых канферэнцыях — два-тры разы на год. Не толькі ў Беларусі, мы таксама два гады запар ездзілі на конкурс імя Вярнадскага ў Маскву. Першы раз перамаглі, другі атрымалі дыплом I ступені. А сёлета не паехалі — не было грошай... У нас ёсць традыцыя перадаваць на апошняй лінейцы альбом выпускнога класа ў музей. Першы выпуск у школе быў у 1948 г. — вось ужо семдзесят гадоў традыцыя працягваецца, і ўсе альбомы захоўваюцца. Трэба сказаць, шмат хто з былых вучняў намагаецца штосьці зрабіць для развіцця музея, дапамагчы ў рэканструкцыі і пошуках.

### ПРА ЛЕГЕНДЫ

— Я знайшоў каля дзесяці легенд аб паходжанні назвы Лебедзева. Нават сусветна знакамітыя гарады, як Ерусалім, Афіны, Рым, не маюць такой колькасці легенд. Спачатку мястэчка называлі «Лебедзева Дно». Потым «Дно» згубілася і засталося толькі «Лебедзева», — расказвае Антон Апанасевіч.

Самая знакамітая легенда апавядае пра тое, што калісьці на месцы, дзе зараз паўстаў аграгарадок, паміж двух пагоркаў знаходзілася вялікае возера. На берагах вадаёма жылі людзі, а на выспе пасярэдзіне — лебедзі. Але ніхто на іх не паляваў, бо ведалі: птушкі ахоўваюць возера і тайна ад людзей будуюць і рамантуюць дамбы і плаціны. Але, як звычайна, знайшоўся адзін злы чалавек, які застрэліў


Антон Апанасевіч.

лебедзя. Птушкі пакрыўдзіліся і назаўсёды пакінулі сваё месца жыхарства. З часам дамбы прагнілі, а возера выйшла з берагоў, затапіўшы хаты, ураджай і скаціну. Прайшоў час, і людзі пачалі сяліцца на дне былога возера, даўшы паселішчу назву «Лебедзева Дно».

### ПРА ЗНАКАМІТЫХ ЛЕБЕДЗЕЎЦАЎ

— Самае важнае — гэта людзі. Не кожны вялікі горад мае столькі знакамітых асоб, колькі нарадзілася ці вучылася тут. Напрыклад, Раман Семашкевіч. Адзін з найлепшых савецкіх мастакоў 20—30-х гг. У Маскве яго шануюць, карціны ў Траццякоўскай галерэі вісяць. А ў Беларусі Семашкевіча мала хто ведае, нават у падручніках па гісторыі няма яго імя. Мне з вялікай цяжкасцю як дэпутату ўдалося назваць адну вуліцу ў гонар славутага земляка. І то не ў Лебедзеве, а ў суседняй вёсцы! Што цікава, Іван Корсак, зяць Барыса Кіта, заснаваў лебедзеўскі хор. Гэта адзіная ў рэспубліцы вясковая народная харавая капэла. Цяпер гэтую традыцыю працягваюць у нашай музычнай школе, — Антон Антонавіч не схлусіў, калі сказаў, што з Лебедзевым звязаны лёсы многіх знакамітых людзей. Сярод іх — сусветна вядомы навуковец Барыс Кіт, беларускі савецкі паэт і літаратуразнавец Рыгор Семашкевіч, сучасны паэт Канстанцін Цыбульскі, вучоныя Васіль Рагуновіч і Яўген Шыраеў, гісторык Генадзь Каханоўскі, народная артыстка Чувашыі Тамара Супоніна і інш.

### ПРА ЯНКУ КУПАЛУ

— А вось самавар, з якога піў сам Янка Купала. Справа ў тым, што ён сябраваў з грамадскім дзеячам і педагогам Андрэем Посахам, жыхаром нашай вёскі, і часта заязджаў да яго, калі працаваў на броварах ў Яхімоўшчыне, — працягвае расповед краязнаўца. — У Лебедзеве наш класік напісаў верш «А як выйдуць чарнасотнікі», што быў надрукаваны ў газеце «Наша ніва» ў 1908 г. І менавіта наш Посах — першы чалавек, што пазнаёміў Максіма Горкага, з якім адпачываў на Кіпры, з творчасцю Янкі Купалы і Якуба Коласа.

### ПРА ВІТРАЖ СВЕНТАЖЭЦКІХ

— Вітраж з капліцы Свентажэцкіх у Маліноўшчыне. Капліца была пабудавана італьянцамі, якія прыйшлі з французамі падчас вайны 1812 г. Завод, якому цяпер належыць капліца, не стаў замарочвацца: паставіў у малельні звычайнае шко, а вітраж аддаў нам, успамінае А. Апанасевіч.

Капліца старажытнага роду Свентажэцкіх з фамільным склепам уяўляе сабой чатырохвугольную піраміду. Калісьці да яе вяла незвычайная алея: пачыналася яна нізкімі дрэвамі, якія паступова, па меры аддалення ад малельні, павялічваліся. Стваўраўся эфект узлёту. Свентажэцкія верылі, што алея дапаможа арыентавацца душам памерлых. Двойчы бальшавікі абражалі капліцу — у 1920 і 1939 гг. Але, нягледзячы на выпрабаванні, яна добра захавалася да нашых дзён.

### ПРА БАРЫСА КІТА

— З Барысам Кітом мне пашчасціла размаўляць у апошнія гады яго жыцця. Для славутага навукоўца Лебедзева было вельмі знакавым месцам. Сам ён нарадзіўся ў Пецярбургу, карані яго ў Карэлічах. А жонка Ніна Корсак з Лебедзева. І калі мяне папрасілі напісаць кніжку («Лебедзеўская сага». — Заўв. аўт.), я ўсё думаў, хто напіша прадмову. І Барыс Кіт пагадзіўся. Тут якраз ёсць экземпляр, падпісаны ім самім, — звяртае ўвагу настаўнік.

Барыс Уладзіміравіч Кіт — вялікі вучоны, які займаўся распрацоўкай паліва для касмічных караблёў, траекторыі палёту на Месяц; аўтар першага падручніка па ракетным паліве — жыў у Лебедзеве ў 1941—1944 гг. са сваёй сям'ёй.


Фрагмент экспазіцыі.

Менавіта там нарадзіўся яго старэйшы сын Уладзімір, якім, дарэчы, таксама можа ганарыцца яго радзіма. Уладзімір Кіт скончыў чатыры факультэты Вашынгтонскага ўніверсітэта, займаў пасаду намесніка міністра астранаўтыкі ЗША, дасягнуў поспехаў у галінах палітыкі, фізікі, камп'ютарных тэхналогій і спорту.

### ПРА ДЗЯДЗЬКУ ШЫМОНА ПЭРЭСА

— Да нас прыязджаюць з розных краін. Адкуль толькі наведвальнікаў ні было! Нядаўна прылятаў равін з Нью-Ёрка — хацеў паглядзець, адкуль яго карані. Дарэчы, тут жыў родны дзядзька Шымона Пэрэса — былога прэзідэнта Ізраіля. У Лебедзеве яго клікалі не Пэрэсам, а Перцам. У нас ёсць цікавы фотаздымак. Гэта пажарная варта Лебедзева, 1938 г., сваяк Пэрэса — крайні справа ў трэцім радзе.

Дзядзька былога прэзідэнта Ізраіля выконваў ролю апавяшчальніка пры пажары — гукаў у трубу, даваючы сігнал аб узгаранні. У 1942 г. разам з іншымі яўрэямі быў спалены нямецкімі захопнікамі.

### ПРА ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ МОГІЛАК

— Недалёка ад Лебедзева, каля Беніцы, знаходзяцца брацкія могілкі часоў Першай сусветнай вайны. І на гэтым месцы быў сметнік. Калісьці на могілках стаяў крыж, але за савецкім часам пра іх забыліся. І толькі ў мінулым годзе намаганнямі нашых вучняў (таксама і былых) пахаванні былі расчышчаныя. Спіртагарэлачны завод у Маліноўшчыне па нашай просьбе дапамог зрабіць спецыяльны памятны знак. Паставілі крыж на брацкіх могілках, прывялі тэрыторыю ў парадак. Дакументамі дапамаг Расійскі дзяржаўны ваенны архіў, — гаворыць Антон Апанасевіч.

У музеі даволі экспанатаў часоў Першай сусветнай вайны. Недалёка ад Лебедзева, у смаргонскім напрамку, быў так званы Свянцянскі прарыў, таму засталося нямала рэчаў, якія нагадваюць аб баявых дзеяннях: пагоны, біклажкі, спражкі, сталовыя прыборы і інш.

### ПРА СТВАРАЛЬНАСЦЬ

Але гэты музей усё ж нараджае вобраз стваральнага жыцця людзей. Сведчанне гэтаму, напрыклад, — музычны інструмент, які называецца акарыя. Прыдумаў яе італьянскі майстар Джузэпэ Данаці ў 1860 годзе. Потым гэтая незвычайная флейта пачала распаўсюджвацца па Еўропе. У Беларусі яе выраблялі толькі ў трох месцах: Слоніме, Івянцы і Лебедзеве. Тут акарыі стваралі з апошняй чвэрці XIX ст. да пачатку Другой сусветнай вайны. Потым пра гэты музычны інструмент забыліся. Але зараз у лебедзеўскай школе мастацтваў працягваюць традыцыі, і дзеці вучацца граць на акарыі.

Тут адчуваецца свая непаўторная рэальнасць, дзе суседства ваяра ў кальчузе і калаўрота не здаецца дзіўным. Экскурсавод яшчэ доўга распавядаў мне сакрэты экспанатаў музея «Спадчына», які даўно перарос катэгорыю «школьнага». Але ўсё ж было б цудоўна, каб у дзецішча, якому Антон Антонавіч прысвяціў больш як трыццаць гадоў свайго жыцця, з'явілася большая прастора, чым школьны клас. А пакуль спяшайцеся ў маленькі пакойчык, што прытуліўся да аднаго з класаў у лебедзеўскай школе. Там будзе чакаць вас Антон Антонавіч Апанасевіч, цудоўны краязнаўца, настаўнік гісторыі, чалавек, што многія гады безупынна і самааддана збіраў, знаходзіў, адкопваў рэчы, у якіх увасобілася гісторыя Лебедзева і Беларусі.

Ганна ВАРОНКА

# АДМЕТНЫЯ ВЫСТАЎКІ МАЯ

Разглядаем выставачныя праекты, вартыя асаблівай увагі на пачатку мая, якія абяцае шмат вольных дзён. Куды варта схадзіць?

## Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

1 Тут дэманструецца персанальная выстаўка керамікі Тамары Курачыцкай «Скаванае полымя. Скульптура — рэльеф — жывапіс — графіка ў гліне», прымеркаваная да 70-годдзя аўтара. У экспазіцыі каля 30 твораў са збору творцы, некаторыя з іх прадстаўлены ўпершыню.

Адметная, знакамітая кераміка Тамары Курачыцкай — гэта і манументальныя работы (адны з найбольш вядомых упрыгожваюць Нацыянальную бібліятэку Беларусі і канферэнц-залу Мірскага замка), і дэкаратыўныя рэльефныя пано, і скульптура, і вытанчаныя вазы, і малая пластыка. Мастачцы падабаецца працаваць з самымі рознымі жанрамі, у тым ліку з такімі, якія больш характэрныя для жывапісу ці графікі (пейзаж, нацюрморт).



Мастачка ўмееператвараць гліняную масу, скаваную полымем, у паветраную, цякучую, меладычную. Палёт, адкрытая нябесная вышыня і поўныя таямніц водныя глыбіні — гэта свет Тамары Курачыцкай, у якім яна адчувае сябе ўтульна і ўпэўнена. Нездарма любімымі персанажамі мастачкі з'яўляюцца птушкі, анёлападобныя істоты, касмічныя прыхадні і рыбы. Таксама мастачцы падабаюцца ракавіны, іх дасканалыя спіральныя формы. Яна зноў і зноў гуляе з гэтымі вобразамі, якія ўвасабляюцца не толькі ў панцырах марскіх малюскаў або слімакоў, але і, напрыклад, у ручках ваз і нават у шахматных постацях.

## Літаратурны музей Максіма Багдановіча

3 Творчая спадчына мастака Барыса Аракчэева дзякуючы намаганням яго сям'і дастаткова шырока вядома беларускаму гледачу. Кожны год дачка мастака Аксана Аракчэева паказвае на розных выставачных пляцоўках невядомыя творы майстра. Гэтым разам яна арганізавала выстаўку «Дом на вуліцы Любімскай», дзе прадстаўлены палотны Барыса Аракчэева, звязаныя са знакавымі мясцінамі пісьменніка Максіма Багдановіча.

Справа ў тым, што і мастака, і пісьменніка аб'ядноўвае Яраслаўшчына. Барыс Аракчэеў нарадзіўся на гэтай зямлі і зрабіў тут першыя крокі, а Максім Багдановіч пераехаў сюды з сям'ёй бацькі ў 1908 годзе і скончыў Яраслаўскую мужчынскую гімназію, Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй. Яраслаўль, яго ваколіцы, жыццё буйнога горада адлюстраваны пісьменнікам у шматлікіх нататках, замалёўках, рэпартажах і фельетонах.

Некаторыя з успамінаў Максіма Багдановіча знайшлі адлюстраванне ў творчасці Барыса Аракчэева. У фондах музея захоўваюцца яго карціны «Гады вучобы ў гімназіі», «Вясна ў Карабісе», «Дом у Яраслаўлі на вуліцы Любімскай» (дзе якраз з 1912 па 1914 год жыла сям'я Багдановічаў) і іншыя. Гэтыя творы і работы з асабістай калекцыі Аксаны Аракчэевай сталі асновай экспазіцыі. Упершыню прэзентуюцца матэрыялы з архіва сям'і Аракчэевых: эцюды, замалёўкі, працоўныя запісы і лісты Барыса Уладзіміравіча, якія раскрываюць некаторыя сакрэты складанага і шматграннага творчага працэсу.



## Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры»

2 Каля дваццаці беларускіх мастакоў паказалі работы ў жанры пейзаж-фантазія на выстаўцы «Іншыя берагі». Візуальны шэраг экспазіцыі, прадстаўлены жывапісам і арт-шклом, мае лёгкую танальнасць і ненавязлівы аднязначныя інтэрпрэтацыі. Яркі каларыт, экспрэсіўнасць — жывапісныя палотны зараджаюць рамантычным настроем. Метафізічная ўзаемасувязь усіх элементаў выставачнай кампазіцыі падтрымлівае жывыя фантазіі мастацкага шкла, якое сімвалізуе прывідную мяжу рэальнасці і нерэальнасці.

Такія мастакі, як Кацярына Сумарава, Рыгор Іваноў, Сяргей Пісарэнка, Аляксандр Лубнеўскі, Юрый Вінаградаў, Жанна Марозава, Леанід Гоманаў і іншыя, неаднаразова радавалі аматараў мастацтва адметнымі канцэпцыямі. Гэтым разам пейзажысты-рэалісты паказалі, што могуць працаваць з абстракцыяй ці ствараць ві-дэаарт, а прыхільнікі «чыстай» абстракцыі якраз звярнуліся да рэалістычных элементаў жывапісу.



Фантазійныя пейзажы кожнага аўтара — гэта адкрытыя дзверы ва ўяўны свет. Шматмерныя палотны і шкляныя скульптуры дораць гледачам выдатную магчымасць — існаваць за сваім унутраным жаданнем і зазіраць у залюстроўі, аднаўляць «казачныя гарады» са сноў і дзіцячых кніжак.

## Мастацкая галерэя «БЕЛАРТ»

4 На пляцоўцы мастацкай галерэі «Беларт» размясцілася цікавая выстаўка жывапісу Алеся Філіповіча і скульптуры Яраслава Філіповіча «Асяроддзе жыцця».

Выстаўка арганізавана Беларускім саюзам мастакоў да 60-годдзя з дня нараджэння жывапісца Алеся Філіповіча. Майстар прадстаўляе палотны, створаныя пераважна ў пейзажным жанры. Алесь Філіповіч — актыўны ўдзельнік многіх рэспубліканскіх і міжнародных пленэраў. Да таго ж на працягу многіх гадоў ён робіць уласны самастойны этнаграфічна-краязнаўчы пошук: уважліва вывучае сваю малую радзіму Уздзеншчыну, дзе апошнім часам жыве і працуе на сядзібе бацькоў у вёсцы Куль. Цікавыя, з гістарычным падтэкстам, работы прыцягваюць глыбокімі колерамі, своеасаблівай пластыкай. Мастаку вельмі падабаецца жанр пейзажа і партрэта. Усё сваё прафесійнае жыццё Алесь Філіповіч прысвяціў менавіта гэтым кірункам.



Побач з жывапіснымі палотнамі мастака на выстаўцы прадстаўлены бронзавыя скульптуры яго таленавітага сына Яраслава. Работы гарманічна ўпісваюцца ў кантэкст праекта, кранаюць тонкасцю і вытанчанасцю.

## Арт-гасцёўня «Высокае месца»

5 У Арт-гасцёўні «Высокае месца» размясцілася выстаўка работ кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і касцюма Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў «Інтэрферэнцыя». Экспазіцыя дэманструе шырокі спектр магчымасцяў розных тэхнік і матэрыялаў, а таксама неабмежаваны палёт мастацкай думкі. Гэта вынік узаемадзеяння розных кірункаў мастацкага тэкстылю і касцюма, керамікі, шкла і металу, камбінацыя традыцый беларускага мастацтва са свежымі ідэямі і творчымі пошукамі студэнтаў кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Інтэрферэнцыя хваляў у фізіцы — гэта з'ява павелічэння або памяншэння яркасці выніковай хвалі пры складанні дзвюх або некалькіх хваляў. Падобна таму, як інтэрферэнцыя дае магчымасць убачыць каляровыя разводы, так і ўзаемадзеянне традыцый і досведу выкладчыкаў кафедры з аўтарскім эксперыментам студэнтаў нараджае нечаканыя візуальныя эфекты.

Вывучаючы розныя спосабы дэкарыравання і трансфармацыі тканіны, студэнты распрацавалі асабістыя калекцыі, удзялілі асаблівую ўвагу тэатральнаму касцюму. У работах у кераміцы, шкле, метале мастакі выкарыстоўвалі ручныя і механізаваныя тэхнікі, эксперыментавалі з формамі і аўтарскімі падыходамі.



Матэрыялы старонкі падрыхтавала Вікторыя АСКЕРА

*Наталля ГАЙДА:*

# «Для артыстаў прафесійная планка павысілася»

**Ёсць юбілеі, а здараецца і так, што ў адзін год ёсць збег некалькіх дат. Але ў дачыненні да Наталлі Гайды хочацца ўжыць слова «свята». Яе асабістае свята (дзе ёсць прыгожая і пашанотная лічба) — гэта свята і для ўсіх гледачоў, якім артыстка служыць ад пачатку творчай дзейнасці 60 гадоў (спявае і выступае як драматычная актрыса). Свята ў гонар народнай артысткі Беларусі адбылося ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры, дзе яна выходзіць на сцэну з 1970 года.**

**Яна першая выканаўца галоўных жаночых роляў у спектаклях беларускіх кампазітараў Юрыя Семянякі («Спявае “Жаўрук”», «Паўлінка», «Тыдзень вечнага кахання»), Рыгора Суруса («Несцерка»), Андрэя Мдзівані («Дзяніс Давыдаў»), Яўгена Глебава («Мільянерша»), Уладзіміра Кандрусевіча («Джулія», «Шклянка вады»). Але таксама яна Віялета, Марыца, Сільва, Разалінда, графіня Мальбара, Эліза Дулітл, Мадам Рэнесанс… Яркія партыі і лепшыя эпізоды жыцця артыска згадала падчас святочнага вечара. Некаторыя яе ўспаміны і думкі гучаць сёння для нашых чытачоў:**

## ПАЧАТАК КАР'ЕРЫ

— Я не мела адносінаў да тэатра аперэты, пакуль не пераехала ў Мінск, пры тым, што гэты жанр вельмі любіла. Напачатку была праца ў Свярдлоўскім акадэмічным тэатры оперы і балета, у які мяне запрасілі на чацвёртым курсе кансерваторыі ў 1965 годзе. Гэта на той час быў адзін з лепшых тэатраў. Мой муж Юрый Бастрыкаў спяваў там увесь рэпертуар, у тым ліку партыю Дэмана, якая цудоўна лягла на яго голас. Я за 4 гады таксама выканала 15 партый. Разам мы спявалі ў «Снягурцы» і «Царскай нявесце» Мікалая Рымскага-Корсакава, у спектаклі «Рамэа і Джульета ды цемра» савецкага кампазітара Кірыла Малчанава.

Але неяк у Свярдлоўск прыехаў Кірыл Кляменцьевіч Ціханаў, дырыжор беларускага тэатра оперы і балета, і распавёў пра конкурс барытонаў, які праводзіўся ў Мінску. Мы ведалі пра гэты тэатр, таму што трупа беларускага тэатра тады шмат гастралявала. Багата з кім з беларускіх артыстаў пазнаёміліся. Потым Юра з'ездзіў у Мінск, выйграў конкурс барытонаў, і яго запрасілі ў тэатр. Кірыл Кляменцьевіч прапанаваў працаваць у Вялікім тэатры Беларусі і мне, нягледзячы на тое, што ў маім голасе трупа не мела неабходнасці: тады яшчэ спявалі Тамара Мікалаеўна Ніжнікава, Люда Златова і іншыя.

На мінскай опернай сцэне я праслужыла год, спявала Мюзету ў «Багеме» і Фраскіта ў «Кармэн». У гэты ж год мяне запрасілі ў Свярдлоўск узяць удзел у здымках фільма-спектакля «Званая вячэра з італьянцамі» Офенбаха. Мяне адпусцілі. А калі вярнулася ў Мінск, была запрошана ў тэатр музычнай камедыі, які толькі адкрыўся. Я пагадзілася і ніводнага разу потым не пашкадавала.

## КАР'ЕРА І СЯМ'Я

— Мы пазнаёміліся на першым курсе, а на другім, пасля вясновых экзаменаў, сталі з'яўляцца ўсюды разам. Калі блізка маеш зносіны з чалавекам, бачыш, як ён ставіцца да сваіх блізкіх, да цябе, да тых, хто навокал. У нейкі момант я зразумела, што самая асноўная рыса Юры — надзейнасць, прычым ва ўсім: у працы, у адносінах з людзьмі. Мне здаецца, што гэта наогул самая галоўная рыса ў чалавеку, аснова ўсяго: такі ніколі не здрадзіць, ён адказны за сям'ю, за сваю працу. І зараз я разумею, што пражыла ўсё жыццё ЗА мужам.

Юра працягваў пасляхова працаваць у оперы. Ён хадзіў на мае прэм'еры, а я першых гадоў дваццаць старалася пaглядзець усе яго спектаклі. Але потым перастала, таму што нервавалася падчас яго выступаў больш, чым падчас сваіх. Я была цалкам спакойная адносна яго голасу, але чаплялася да акцёрскага майстэрства. А ён мяне заўсёды хваліў. Гэта адно з вельмі важных яго якасцяў. Часта адзначаюць, што ў акцёрскай сям'і, калі абодва сужэнцы на сцэне, можа ўзнікнуць нейкая творчая рэўнасць. А ён заўсёды так радаваўся за мяне... Таксама і выхаванню дачкі ён аддаваў больш часу, таму што я першыя гадоў пятнаццаць раніцай і ўвечары стала знаходзілася ў тэатры аперэты.

У 1999 годзе Юрый Георгіевіч атрымаў званне народнага артыста Беларусі. Яму было 62 гады. Мы ўжо і не чакалі гэтага звання, хоць ён быў у добрай музычнай форме. Ён радаваўся гэтай узнагародзе шчыра, як дзіця. І спяваў бы яшчэ, калі б не яго сэрца. З-за хваробы і 2-й групы інваліднасці давялося адмовіцца ад сцэны. Апошні раз Юра праспяваў на вечары памяці Аркадзя Саўчанкі партыю Рэната. Я чула, што яму было цяжка, і пасля гэтага выступу папрасіла даць мне слова, што ён не будзе нават спрабаваць выходзіць на сцэну.

Ён звольніўся з тэатра ў 2002 годзе. На пенсіі ўсё роўна не мог сядзець без справы. І нават будучы ўжо вельмі слабым, уставаў і заўсёды сустракаў мяне ў пярэднім пакоі, калі я прыходзіла пасля спектакля. Я ціхенька паварочвала ключ, каб яго не патрывожыць і, адчуваючы, што ён устае, казала: «Юрачка, пачакай, я зараз прыйду». Але ён уваходзіў і ўсё роўна дапамагаў мне зняць паліто. Я дакладна ведаю: калі б не Юра, у мяне не склалася б ні кар'ера, ні сям'я. Я вельмі гэта цаніла і ўсё жыццё яму пра гэта казала. Шчасце, што гэта ў нас было…



## СЯМ'Я І ТВОРЧАСЦЬ

— Маё дзяцінства прайшло ў Свярдлоўску і ў Сяміпалацінску. Мама вучылася ва Уральскай кансерваторыі, валодала прыгожым сапрана, але вучобу перапыніла вайна. Тата пайшоў на фронт, а яна засталася ў Свярдлоўску са мной на руках. У 1944 годзе, калі з'явілася магчымасць выехаць на цягніку, мама адвезла мяне ў Сяміпалацінск да бацькоў таты. У Казахстане я жыла і вучылася да 9 класа. Бацька быў па прафесіі геолагам. Калі дэмабілізаваўся, працягнуў працаваць начальнікам геолагаразведачнай экспедыцыі. Яны з мамай жылі спачатку ў Карагандзе, потым у Сяміпалацінску, а затым яго перавялі ў Іркуцк, дзе я і скончыла дзесяцігодку. Я памяняла некалькі школ, але ўсюды займалася ў гуртках — вакальных, танцавальных, драматычных.

У Свярдлоўску падчас вайны мама працавала ў філармоніі. Ёй давялося пакінуць кансерваторыю. У гэтыя гады ў Свярдлоўску ў эвакуацыі знаходзілася Кіеўская кансерваторыя. У дзвюх кансерваторыях вучыліся будучыя зоркі савецкай оперы. У Кіеўскай займалася знакамітая спявачка Ірына Масленікава. Маміны аднакурсніцы па Свярдлоўскай кансерваторыі — Вераніка Барысенка, якая стала пазней салісткай маскоўскага Вялікага тэатра, і вядомы кампазітар Людміла Лядава. Я, кіруючыся юнацкім максімалізмам, казала ёй: «Значыць, і ты магла б спяваць у Вялікім! Значыць, ты не хацела! Вось я б на тваім месцы...» Але мама працавала, каб нам неяк выжыць. Таму бацькі так радаваліся, калі ў 1966 годзе пасля гастроляў Свярдлоўскай оперы ў Маскве пра мяне ўпершыню напісалі вялікі артыкул у «Культуры». Пазней ужо ў Мінску яны часта прыязджалі з Урала на мае спектаклі, канцэрты, калі я атрымлівала высокія званні.

## ТВОРЧЫЯ ЧАСЫ

— Калі я была студэнткай чацвёртага курса, то ўпершыню спявала ў оперным спектаклі — Б'янку ва «Утаймаванні свавольнай» рэжысёра Марка Мінскага. Мяне, студэнтку, запрасілі замяніць спявачку, таму што я ведала партыю і праспявала спектакль практычна без рэпетыцый.

Першая праца з рэжысёрам — партыя Мюзеты ў «Багеме». Памятаю, як я прыйшла на рэпетыцыю і напружана чакала ўказанняў рэжысёра Георгія Мілера. А ён мне: «Вось тут стаяць госці, тут — навес над кафэ, тут — стол — дзейнічайце». Я не разгубілася... Калі скончыла сцэну, Мілер мне кажа: «А на спінку крэсла заскочыць зможаце?» Адказала, што змагу. Заскочыла. І практычна ўсё, што я тады зрабіла, засталося ў спектаклі. Даць артысту свабоду — гэта дарагога вартае.

Мне пашчасціла працаваць у тыя гады, калі быў росквіт савецкай аперэты: для нас шмат пісалі кампазітары і драматургі. Тэатры маглі сабе дазволіць часта запрашаць розных рэжысёраў з іншых тэатраў. Кожны год тэатр музкамедыі выязджаў на летнія гастролі па Савецкім Саюзе. Публіцы падабаліся нашы пастаноўкі, людзі запаміналі імёны артыстаў. Мне нават расказвалі, як на гастролях у Сочы, якія я ў той год прапусціла, гледачы, купляючы квіткі, пыталіся: «А Гайда іграе?» Цікавасць гледачоў была вялікая. Масква запрашала спевакоў з розных рэспублік для ўдзелу ў канцэртах саюзнага маштабу: у Калоннай зале Дома Саюзаў, у Алімпійскім. Вядучыя артысты з розных тэатраў Саюза ведалі адзін аднаго. Мы часта запісваліся на радыё. Выступалі на тэлебачанні: у навагодніх «Блакітных агеньчыках» у 1976 годзе я спявала Джудзіту з балетам Маскоўскага музычнага тэатра, а ў 1979 выступала разам з партнёрам з Эстоніі Вальдэмарам Куслапам. Гэта былі цікавыя часы.

Вядома, мяняюцца час, густы, светаадчуванне. Змяняемся мы, акцёры, мяняецца глядач. Сёння гледачы больш развітыя і музычна, і тэатральна. Перад табою ўвесь свет на экранах тэлевізараў, камп'ютараў і г. д. Таму і для артыстаў прафесійная планка павысілася. Сёння ў пастаноўках, прэм'ера якіх адбылася даўно, але якія па-ранейшаму карыстаюцца поспехам у публікі, мы прыбіраем некаторыя рэчы, якія ўжо выглядаюць наіўна. Мы павінны не толькі адпавядаць нашым гледачам, але і быць трохі наперадзе. Каб гледача скарыць, мне здаецца, артыст павінен заўсёды іграць як у апошні раз. Напэўна, сучасны тэатр — той, які сённяшняга гледача чапляе, а інакш гэта не мастацтва.

## ЧАС ПРЫМАДОННЫ

— На сцэне я павінна адчуваць сябе прымадоннай, таму што калі я не буду верыць у сваіх гераінь сама, то не паверыць і глядач. Калі выходзіш на паклон у канцы спектакля, у святле сафітаў атрымліваеш букеты і апладысменты і адчуваеш глыбокае пачуццё прафесійнага задавальнення ад таго, што я гэта зрабіла, дайшла да вас душой, і мяне зразумелі, — гэта той момант, для якога мы і працуем. Але ў жыцці рабіць з сябе прымадонну, зорку, па-мойму, смешна, і нават не зусім прыстойна. Да таго ж слова «прымадонна» часам гучыць негатыўна і становіцца амаль намінальным: капрызная, фальшывая, легкадумная, шалапутная асоба, якая думае толькі пра сябе і свае жаданні. Хоць мы ўсе воляй-няволяй у жыцці іграем, імкнёмся здавацца цікавейшымі, чым мы ёсць, але гэта натуральнае жаданне нармальнага чалавека.

Акцёрскае самалюбства цешыць, калі рэжысёр бачыць толькі цябе і лічыць, што толькі ты зможаш справіцца з роляй. Так, гэтае самалюбства грэе, і ты будзеш са скуры вылузвацца на рэпетыцыях. Але калі прызначаюцца дзве ці тры выканаўцы адной ролі — гэта яшчэ больш цікава, гэта канкурэнцыя, гэта прымушае працаваць, таму што стаць самай лепшай з іх — найвышэйшы пілатаж…

**Вольга САВІЦКАЯ**

фестываль




# Час магчымасцяў

Ззяць пяць гадоў — і паявлічваць свячэнне… Аматары сучаснага кіно чакаюць вясны, бо ў Беларусі ў гэты час назіраецца «Паўночнае ззянне». Гэты міжнародны кінафестываль ужо набыў і пэўны імідж, і займеў сваю аўдыторыю, якая вельмі актыўна ставіцца да жыцця і рэагуе на тэмы, якія яно падкідвае для роздуму, і калі знаходзяцца адказы, то гэта нібыта тое святло, якое пачынае пульсаваць у чалавеку, натхняючы на стваральнасць. І сапраўды, «Усё магчыма» — сёлетні слоган кажа нам пра бязмежныя магчымасці свету, якія адкрываюцца кожнаму. Што ў гэтым дапамагае?

**Сферычнае кіно.** Сёлета спецыяльна да 5-годдзя кінафестывалю «Паўночнае ззянне» для гледачоў падрыхтаваны падарунак: упершыню адбудуцца паказы паўнакупальнага (сферычнага) кіно пра Паўночнае ззянне — і можна любавацца прыгожай прыроднай з'явай, якая вялікая рэдкасць для Беларусі. Фільмаў нават некалькі: «Палярнае ззянне Кагая» (з беларускімі субцітрамі), «Аўрора: цудоўнае святло» (англійскімі субцітрамі). 12 і 16 мая праглядзь пройдуць у Мінскім планетарыі.

**Людзі.** Тыя, хто можа ад сабе асабіста сказаць: «Усё магчыма». Арганізатары запрасілі выбітных людзей сучаснасці, якія задзейнічаны ў розных сферах, маюць свой голас і здолелі дасягнуць поспехаў. Сустрэчы, майстар-класы, дыскусіі — дзеля таго, каб натхніць беларусаў рухацца наперад, лепш разумець сябе і ісці па жыцці з усмешкай.

**Стужкі.** Традыцыйна «Паўночнае ззянне» прадстаўляе фільмы са Швецыі, Нарвегіі, Даніі, Фінляндыі, Ісландыі, Эстоніі, Літвы, Латвіі. А сёлета ўпершыню будзе карціна з Грэнландыі — «Аноры», якую прадставіць галоўная актрыса і спявачка Нукака Костэр-Вальдау, вядомая па «Гульні тронаў». Таксама значную частку праграмы складаюць дакументальныя фільмы.

**Жанчыны.** Яшчэ адна адметнасць: роўна палова фільмаў асноўнай праграмы знятая жанчынамі-рэжысёрамі. Усе карціны з сёлетняй праграмы ў Беларусі паказваюцца ўпершыню, але іх сусветныя прэм'еры адбыліся на буйных міжнародных кінафестывалях. Напрыклад, фінскі дакументальны фільм «Дзіўнае жыццё дзяўчыны па імені Ві» і дацкая карціна «Вакацыі» ўдзельнічалі ў амерыканскім *Sundance*. Ісландскі фільм «Жанчына на вайне» адзначаны прызамі на «Тыдні крытыкі» ў Канах-2018. Літоўскі фільм «Перыжыць лета» пра псіхалагічныя хваробы быў паказаны ў Таронта. Шведскі дакументальны фільм «Добры тыдзень для дэмакратыі» звярае ўвагу да пераваг свабоднага фармату дыскусій, яго прэм'ера адбылася на кінафестывалі ў Гётэборгу. Эстонская драма «Бяры ці бяжы» вылучалася на «Оскар» ад Эстоніі.

**Глядзіце беларускае.** Ёсць у праграме і штосьці наша. Напрыклад, фільм Аляксандра Міхалковіча «Мая бабуля з Марса», прадзюрам якога выступіла дырэктарка «Паўночнага ззяння» Вольга Чайкоўская, таксама ўпершыню быў паказаны на чэшскім фестывалі ў Іглаве.

**Рэтраспектыва.** Таксама ўпершыню адбываецца на гэтым фестывалі. У цэнтры ўвагі — паказы фільмаў Лайлы Пакальніня (Латвія), аўтар прадставіць свае фільмы сама.

**Дзеці.** Таму што будучыня, якую трэба выхоўваць. Дзеля гэтага створана ўпершыню праграма «Ззя-*kids*». Між іншым, разам з дзецьмі дарослыя могуць паглядзець анімацыйныя фільмы з беларускай агучкай — «Якаб, Мімі і сабакі, якія гавораць» (Латвія) і «Вясёлую ферму» (Нарвегія) пра карову, якая марыла стаць знакамітай спявачкай. «Паўночнае ззянне» становіцца фестывалем, на які можна хадзіць сям'ёй.

**Сям'я.** І разважаць пра сямейныя праблемы. Напрыклад, падчас дыскусіі пра сузалежныя адносіны — разам з рэжысёркай фільма «Вакацыі» Іза-бэлай Эклёф. Спецыялістам будзе карысна наведаць майстар-клас эстонскага прадзюсара Іва Фельта, які распавядзе, як стварыць оскараўскую кампанію для фільма, — бо спадзяёмся, што і нам гэта спатрэбіцца рана ці позна.

Наогул, фестываль магчымасцяў сваім прыкладам даказвае: можна стварыць паспяховыя незалежныя праекты, якія будуць цікавыя. З 10 па 17 мая ў межах фестывалю будзе паказана 18 стужак.

Марыя АСІПЕНКА

паглядзім?

# Не загінуць у тумане

**У першыя майскія дні фільмам пра вайну знойдзецца месца ў тэлеэфіры. Ці шмат з іх будзе такіх, што кранаюць сёння? Ці шмат тых, якія гавораць пра тое, што тычылася і тычыцца нас? Бо калі ўспомніць гісторыю кіно — айчыннага і савецкага наогул, — то менавіта зварот да беларускага досведу даваў падставы для стварэння стужак, якія вылучаліся асаблівым драматызмам, глыбінёй чалавечых перажыванняў. Частка з іх стваралася на беларускім матэрыяле, была заснаваная на добрай літаратуры, створанай тымі, хто ведаў, пра што піша. А іх думкі агучвалі праз кіно рэжысёры, якія разумелі, пра што здымаюць. У Беларусі і пра яе — у тыя ваенныя гады — паўсталі выдатныя кінаработы, якія стваралі гонар айчыннай кінагаліне. Але самае галоўнае — тыя фільмы можна глядзець сёння як сапраўдныя кінашэдэўры, якія распавядаюць пра чалавека ў нечалавечых умовах.**

**1. Фільм «Праз могілкі» (рэжысёр Віктар Тураў, сцэнарыст Павел Нілін), 1964 г., «Беларусьфільм».**



Чаму глядзець? Не толькі таму, што ў 1994-м рашэннем ЮНЕСКА стужка была ўнесена ў спіс 100 найлепшых фільмаў свету пра вайну.

…Аказаўшыся без зброі, партызаны пасылаюць маладога Міхася ў вёску, да механіка Бугрэева, які пагадзіўся зрабіць для партызан выбухоўку з авіябомбаў і снарадаў. Яны прыходзяць у вартоўню, дзе схаваныя снарады, разводзяць агонь і пачынаюць выталпліваць выбухоўку ў амаль разбуранай капліцы на могілках. Нечакана з'яўляюцца немцы. Міхась з неахвотай ідзе на гэта заданне: ён баіцца сустрэчы з жонкай Бугрэева Соф'яй Казіміраўнай, якая не можа дараваць гібелі двух яе сыноў, якіх ён звёў у атрад. Не падабаецца Міхасю і выдадзены яму фальшывы пропуск. Вязе Міхася Сазон Іванавіч, які па заданні партызан супрацоўнічае з немцамі…

Нетаропкі фільм зацягвае не толькі сюжэтам, але і відэашэрагам, сімвалізмам. Знятыя разнапланава і з акцэнтамі магільныя крыжы падкрэсліваюць асноўную думку: могілкі — гэта не проста тэрыторыя пахавання родных і блізкіх, рана, пакінутая вайной у душах тых, хто застаўся ў жывых.

**2. «Іван Макаравіч» (рэжысёр Ігар Дабралюбаў, сцэнарыст Валерый Саўчанка), 1968 год, «Беларусьфільм».**

Дзеці на вайне — тэма, ад якой крывавіць сэрца. І гэта зразумела любому чалавеку ў любым пункце свету. Таму фільм здабыў шэраг міжнародных адзнак: Гран-пры «Сярэбраная Мінерва» «За высокае выканальніцкае майстэрства акцёраў і выдатнае тэхнічнае вырашэнне фільма, што надало яму асаблівую выразнасць» на XXII МКФ дзіцячых фільмаў у Венецыі ў 1970 годзе, спецыяльны прыз і дыплом I ступені за найлепшы фільм для дзяцей і юнацтва на кінафестывалі рэспублік Прыбалтыкі, Беларусі і Малдавіі ў 1969-м.

У звычайным беларускім гарадку жыве просты хлопчык Ваня — жыве, як астатнія яго аднагодкі. Пачынаецца Вялікая Айчынная вайна. 13-гадовы хлопчык Іван губляе ўсіх блізкіх. Бацька пайшоў на фронт, маці загінула пры бамбёжцы. Івану даводзіцца выжываць, спадзеючыся толькі на свае сілы. Ён эвакуіруецца за Урал,



уладкоўваецца на завод і нават знаходзіць магчымасць дапамагчы незнаёмым. Ён — як дарослы — воляй лёсу вымушаны ўзяць адказнасць за жыццё. Ён ведае, якая высокая яго цана…

**3. «Альпійская балада» (рэжысёр Барыс Сцяпанаў, аўтар сцэнарыя Васіль Быкаў), 1965 г., Беларусьфільм. На кінафестывалі ў Дэлі ў 1968 годзе атрымаў прыз за найлепшы фільм.**



Сапраўды, вельмі кранальная гісторыя пра каханне на вайне, якую распавёў пісьменнік Васіль Быкаў. Кранае тым, што людзі заўсёды скіраваныя на жыццё, нават калі знаходзяцца ў палоне. Беларус Іван ды італьянка Джулія праживаюць разам тры дні, калі збеглі з полону і хаваюцца ад фашыстаў. Але гэтыя дні былі напоўненыя каханнем і надзеяй на тое, што ўцекачы здолеюць уратавацца. Яны размаўляюць на розных мовах, ім трэба рухацца ў розныя бакі, але нешта прымушае ісці разам. Разам яны хочуць уратавацца. Паратункам у складаных умовах альпійскіх пейзажаў становіцца пачуццё. Небяспека адступае хоць на кароткі час…

**4. «Ідзі і глядзі» (рэжысёр Элем Клімаў, сцэнарый Алеся Адамовіча і Элема Клімава), 1985 год, сумесная вытворчасць студый «Беларусьфільм» і «Масфільм».**

Найлепшы фільм 1986 года па-



водле часопіса «Савецкі экран». У аснову сцэнарыя ўзятая «Хатынская аповесць», у якой распавядаецца пра падзеі 1943 года, калі па Беларусі пракаціліся нацысцкія карныя акцыі. Хлопчык Флёра становіцца сведкам адной з іх. І яго свядомасць фіксуе жудасныя кадры распраў над мірнымі жыхарамі. У выніку ён ператвараецца ў сівога старога. Фільм выклікаў рэзананс і ўразіў натуралізмам і кадрамі, якія ўспрымаюцца як рэальныя: хочацца заплюшчыць вочы і думаць пра тое, каб такога больш не паўтаралася нідзе і ні для кога.

**5. «У тумане» (рэжысёр Сяргей Лазніца, ён жа аўтар сцэнарыя, створанага паводле аповесці Васіля Быкава), 2012 г., сумесная вытворчасць шэрагу замежных кампаній пры ўдзеле «Беларусьфільма».**

На 65-м Канскім кінафестывалі



стужка была адзначана прызам ФІПРЭСІ за лепшы фільм асноўнага конкурсу, акрамя таго, атрымала галоўныя ўзнагароды на шэрагу кінафестываляў.

Экзістэнцыяльная ваенная драма ў XXI стагоддзі звяртае да праблемы выбару ў няпросты час: акупацыя, немцы караюць усіх, хто мог быць датычны да крушэння цягніка. Але пуцявога абходчыка Сушчэню вызваляюць. Гэта выклікае недавер да яго. Да сям'і наведваюцца партызаны і вядуць мужчыну на пакаранне за здраду. Але, недаацаніўшы ворагаў, трапляюць у пастку. Той, каго павінны былі пакараць, цягне на сабе параненага партызана, не ведаючы, чым скончыцца яго шлях, але пакуль галоўнае — сысці ад ворагаў… Лес і прырода схіляюць да глыбокіх разваг: што рабіць Сушчэні, калі не было здрады, але і даверу няма?.. Лес адказвае цішынёй…

*Кацярына ШЫМАНОВІЧ:*

# «Жанчыне-кампазітару даводзіцца даказваць, што яна можа пісаць музыку»

**Біяхімік па першай спецыяльнасці, спецыяліст па музычнай тэрапіі, шматдзетная маці — усё гэта сышлося ў адной асобе, якая плённа стварае як кампазітар. Напрыклад, напрыканцы сакавіка на сцэне Музычнага тэатра адбылася прэм'ера балета для дзяцей «Джэймс і Персік-волат» у пастаноўцы Сяргея Мікеля. Музыку балета напісала малады кампазітар Кацярына Шымановіч.**

**— Даволі распаўсюджаны стэрэатып, быццам дзіцячая музыка простая, абмежаваная тэхнічна і вобразна. На што варта звярнуць увагу кампазітару пры напісанні музыкі для дзяцей? На які ўзровень складанасці трэба арыентавацца?**

— Складанне дзіцячай музыкі — задача адказная і няпростая, патрабуе пэўнага кампазітарскага майстэрства. Калі гаворка ідзе пра творы, прызначаныя для выканання самімі дзецьмі, аўтар на шляху дасягнення пастаўленай мастацкай мэты абмежаваны ўзроўнем тэхнічнай складанасці, даступнай юнаму выканаўцу. Калі ж гаворка пра музыку для дзіцячай аўдыторыі ў выкананні прафесійных музыкаў, на першы план выходзіць патрабаванне мастацкай значнасці і яркасці мастацкага матэрыялу.

Сапраўды, існуе меркаванне, што, складаючы дзіцячую музыку, кампазітар можа не асабліва напружвацца і пісаць прасцей. Я ж прытрымліваюся іншага меркавання. Многія дзеці па глыбіні і шчырасці ўспрымання могуць даць фору сярэднестатыстычнаму абывацелю, які па волі выпадку апынуўся на канцэрце сучаснай музыкі. Акрамя таго, музыка, якую дзіця чуе сёння, фарміруе мастацкі густ і каштоўнасці наступнага пакалення слухачоў і музыкантаў. З гэтага пункту гледжання, сачыненне дзіцячай музыкі — задача складаная і адказная, да яе рэалізацыі трэба падыходзіць адпаведна.

**— На мой погляд, вяршыня жанру ў галіне твораў для дзяцей, у любым відзе мастацтва, няхай гэта будзе літаратура, музыка або жывапіс, — творы, у якіх дарослыя таксама могуць многае вынесці для сябе. Як у музыцы знайсці выразныя сродкі, якія будуць даступныя і дзецям, і дарослым?**

— Калі вярнуцца да тэмы балета, у якім няма дыялогаў, а сюжэт глядач даведваецца з кароткага зместу ў праграмках, уся гісторыя павінна быць напісана вельмі буйнымі мазкамі, а ўсе вобразы трэба зрабіць вельмі яркімі. Сюжэтная лінія павінна быць паказана максімальна



выпукла, утрыравана, для таго, каб быць слухачу зразумелай, асабліва калі гаворка пра дзяцей.

У сваёй творчасці я заўсёды імкнуся максімальна выкладвацца, пісаць глыбокую музыку, нават для маленькіх слухачоў. І тады гэта музыка можа быць цікавая і дарослым, і дзецям. Агульнавядомы факт, што нованароджаным дзецям для гарманічнага развіцця рэкамендуюць слухаць Моцарта. А яго музыку ніхто не можа папракнуць у павярхоўнасці і адсутнасці глыбіні. Да гэтага ўзроўню трэба імкнуцца.

**— Балет «Джэймс і Персік-волат» — не першае ваша маштабнае сачыненне для дзяцей. Тры гады таму ў выкананні капэлы «Санорус» прагучала прэм'ера музычнай казкі «Дарункі для сапраўднай прынцэсы». Ці былі адрозненні ў працы над гэтымі творамі?**

— Было некалькі істотных адрозненняў. Першае датычыцца жанру. «Дарункі для сапраўднай прынцэсы» — гэта музычная казка, дзе на першым плане сцэнічнае дзеянне, а музыка, хутчэй, дапаўняе яго і надае спектаклю аб'ём. Але, у першую чаргу, слухач усё ж захоплены дыялогамі і ігрой акцёраў. У балеце ж музыка выходзіць на першы план, а харэаграфія яе ўвасабляе і дапаўняе.

Другое адрозненне заключалася ў тым, што ў казцы, якую ставіла капэла «Санорус», была выкарыстана музыка, што я стварыла раней. Сюжэт быў напісаны спецыяльна пад ужо існуючыя творы, у якія толькі трэба было ўнесці невялікія праўкі. А што датычыцца балета, то сюжэт і лібрэта з'явіліся да таго, як пачалася праца над музычнай часткай твора.

Ну і, вядома, нельга абысці ўвагай той факт, што ў абодвух выпадках за дырыжорскім пультам стаяла выдатны ва ўсіх сэнсах дырыжор Марына Траццякова.

**— У Акадэміі музыкі вы вучыліся ў Вячаслава Кузняцова — прызнанага майстра, у тым ліку і ў галіне балетнага жанру. Ці запазычылі для сябе нейкія метады? Як ішло навучанне?**

— Манера выкладання на кафедры кампазіцыі ў розных педагогаў адрозніваецца, таму важна знайсці родную душу. Мне вельмі пашанцавала ў гэтых адносінах, паколькі, на мой погляд, мы ідэальна падыходзілі адзін аднаму. Вячаслаў Уладзіміравіч даваў большую свабоду дзеянняў, але ўмела накіроўваў у патрэбнае рэчышча, заахвочваў усе пачынанні. Напрыклад, на першым курсе я напісала сімфанічны твор, што ўвогуле не ўхваляецца на кафедры, паколькі навучанне кампазіцыі будуецца па прынцыпе паступовага ўскладнення музычных формаў і маштабаў твора. Сачыненне для сімфанічнага аркестра — задача складаная, патрабуе глыбокіх ведаў, сумежных з кампазіцыяй дысцыплін: інструмента, інструментоўкі. Таму па праграме студэнт-кампазітар павінен пісаць сімфанічны твор толькі на чацвёртым курсе — пасля таго, як авалодае асновамі кампазітарскай тэхнікі. Калі ж я, будучы першакурсніцай, прыйшла на ўрок да Вячаслава Уладзіміравіча і выказала жаданне напісаць твор для сімфанічнага аркестра, ён мяне цалкам падтрымаў і дапамог вырашыць складаную задачу, якую я паставіла перад сабой. Думаю, гэты эпізод аказаў істотны ўплыў на маю далейшую творчасць. І сёння я пішу шмат сімфанічнай музыкі.

Вядома, Вячаслаў Уладзіміравіч не толькі выдатны настаўнік, але і бліскучы мастак, які запальвае вучняў асабістым прыкладам. Безумоўна, ён для мяне — прыклад для пераймання і натхнення.

**— Па першай спецыяльнасці вы біяхімік. У гісторыі музыкі вядомыя прыклады, калі ў кампазітары злучаюцца некалькі прафесій: так, Ксенакіс быў яшчэ і архітэктарам, што аказала ўплыў на яго партытуры. Ці ўплывае ваша першая прафесія на кампазітарскую творчасць?**

— Я лічу, што падзеі, з якімі мы сутыкаемся ў жыцці, адбываюцца не проста так. Усе яны фарміруюць нашу асобу і наша мысленне. Мой звілісты шлях да кампазіцыі, безумоўна, аказаў уплыў на фарміраванне мяне як кампазітара і надаў пэўную індывідуальнасць.

Акрамя таго, два з паловай года таму я атрымала прапанову, якая дазволіла аб'яднаць абедзве мае прафесіі. На працягу двух гадоў я выкладала музычную тэрапію ў Акадэміі музыкі. За час падрыхтоўкі курса і выкладання музычнай тэрапіі я прачытала мноства літаратуры па гэтую тэму і прыйшла да больш глыбокага разумення таго, што музыка не толькі фарміруе душу, але і ўплывае на псіхіку і нават на цела. І гэта таксама з'яўляецца адной са сфер адказнасці кампазітара перад слухачом.

**— Кампазітар Галіна Гарэлава ў інтэрв'ю не раз адзначала, што, нягледзячы на тое, што на кафедры кампазіцыі Акадэміі музыкі сёння вучацца пераважна дзяўчаты, у прафесіі ў асноўным застаюцца мужчыны, паколькі заняткі кампазіцыяй патрабуюць поўнай аддачы, а рана ці позна жанчыне даводзіцца рабіць выбар паміж прафесіяй і сям'ёй. Вы шматдзетная мама. Як вам удаецца сумяшчаць прафесійную дзейнасць з сямейным клопатам?**

— Вялікую ролю адыгрывае падтрымка маёй сям'і — мужа і бацькоў. Значную дапамогу ў творчасці адчуваю з боку мужа Яўгена Шымановіча. Ён высакакласны музыкант-кларнетыст. Таму ў мяне шмат твораў для кларнета, прэм'еры якіх гучаць у выкананні мужа. Ён мяне пастаянна падтрымлівае і, што не менш важна, з'яўляецца першым і абавязковым цэнзарам маіх твораў.

Наяўнасць жа дзяцей змушае пастаянна вучыцца правільна распараджацца сваім часам і рэсурсамі і дасягаць максімальнага выніку за мінімальны тэрмін. А гэта дае перавагу ў такіх «спрынтарскіх» праектах, якім стаў, напрыклад, балет «Джэймс і Персік-волат»: ад моманту з'яўлення канчатковай версіі лібрэта і да прэм'еры прайшло каля 4 месяцаў. Акрамя таго, мне, напэўна, прасцей зразумець вобразную сферу дзяцей, адчуць, што ім можа быць цікава, на якім узроўні гэта павінна быць выкладзена, пераняць, калі трэба, дзіцячы стыль мыслення.

Што датычыцца таго факту, што ў прафесіі застаюцца ў асноўным мужчыны, мне здаецца, справа не толькі ў тым, што дзяўчаты з галавой сыходзяць у сям'ю. На мой погляд, істотную ролю адыгрывае тое, што кампазіцыя негалосна лічыцца мужчынскі прафесіяй і жанчыны-кампазітары ўспрымаюцца як артэфакт, да якога з падазрэннем ставіцца нават іншыя кампазітар-*she*. Таму жанчыне-кампазітару даводзіцца даказваць, што, нягледзячы на свой пол, яна таксама ўмее і можа пісаць музыку — магчыма, робіць гэта крыху па-іншаму, але не горш за мужчын. А вось да гэтага, мне здаецца, гатовыя не многія.

**Любоў СЫЦЬКО**



Фота Кастуся Дробава.

# Права творцы,

## альбо Калі ажываюць нотныя рукапісы

Прафесар Ігар Алоўнікаў, сын кампазітара Уладзіміра Алоўнікава, перадаў правы на выкарыстанне лічбавых копій рукапісаў нот свайго бацькі Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Падзея адбылася ў межах культурна-асветніцкай акцыі «Майстры беларускай культуры. Уладзімір Алоўнікаў», прысвечанай творчасці вядомага беларускага кампазітара, народнага артыста БССР. Стваральнік песень «Радзіма мая дарагая», «Лясная песня», «Песня пра Мінск» быў аўтарам маштабных сіфанічных твораў. Сёлета адзначаецца яго 100-гадовы юбілей.

Госці, якія сталі сведкамі ўрачыстай цырымоніі, змаглі азнаёміцца з выстаўкай, дзе былі прадстаўлены матэрыялы пра жыццё і творчасць выдатнага кампазітара з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Успамінамі пра сяброўства з кампазітарам падзяліліся яго калега Віктар Войцік, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, і Міхаіл Жылюк, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, саліст Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Ігар Алоўнікаў, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, расказаў пра жыццё і творчасць бацькі. І нават паказаў, як яна гучыць. Гэта была ўнікальная магчымасць пачуць музычныя творы кампазітара ў віртуозным выкананні яго сына.

Скарбонка Спадчыны



# Навошта «будзіць продкаў»,

## або Чаму не трэба баяцца духаў памерлых

**Беларусы здаўна верылі: тыя, хто паміраюць, сыходзяць у лепшы свет, але пры гэтым памятаюць пра свет наш, зямны. Таму ў залежнасці ад сваіх магчымасцяў, пераадольваючы вымярэнні існасці, працягваюць клапаціцца пра дзяцей, унукаў. Калі могуць — праз сны, — папярэджваюць пра хваробы ці магчымыя нястачы. Ды і проста нагадваюць пра сябе тым, каго любілі пры жыцці, нібыта кажуць пра сваю безумоўную падтрымку і апеку.**

Цалкам лагічна, што ў традыцыйнай культуры нашага народа вялікая роля адводзіцца ўшанаванню памяці продкаў. На кожнае вялікае свята за агульным сталом трэба абавязкова пакінуць чыстую талерку і напоўніць чарку для не так даўно памерлых продкаў, завітаць на могілкі, на працягу года сачыць за парадкам каля месца пахавання дзеда, бацькі, бабулі, маці… Гэта безумоўныя правілы. Таму невыпадкова на дзявяты дзень пасля Вялікадня, на Радуніцу кожны беларус мае магчымасць так ці інакш згадаць сваіх продкаў.

Зрэшты, не ўсе гэта робяць паводле агульнапрынятых правілаў. Так, у многіх рэгіёнах краіны дагэтуль заведзена запрашаць дзядоў на вячэру адно на восеньскія Дзяды. Недзе продкаў вітаюць у адпаведнасці са старажытным рэгламентам жыцця пэўнай вёскі і кажуць: «Сёння Мікалаеўскія Дзяды. Вось чаму з таго боку вецер дзьме. Нашы будуць пазней».

Але ёсць у нашай краіне вёска, дзе паводле традыцыі продкаў згадваюць ажно тройчы на год. Гэты парадак нават занесены ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

Так, у аграгарадку Раздзялавічы, што ў Ганцавіцкім раёне Брэсцкай вобласці, ушанаванне і зварот да памерлых — важны мясцовы рытуал. Да продкаў тут звяртаюцца як асабіста, так і калектыўна з просьбамі лепшага жыцця, здароўя блізкім і родным, добрага ўраджаю. На працягу года на могілкі «будзіць продкаў» ходзяць на другі дзень Вялікадня, на Успенне (у сярэдзіне жніўня), на восеньскія Дзяды (у пачатку лістапада).

Па традыцыі на другі дзень Вялікадня ў Раздзялавічах сем'і збіраюцца зранку за агульным сняданкам з малітвай. Пасля яго рыхтуюцца ісці на могілкі. У торбу кладуць фарбаваныя яйкі, парэзаны на кавалкі пірог, мясныя стравы, цукеркі. Для памерлых жанчын роду бяруць загадзя падрыхтаваны вышыты фартушок, мужчынам — вышыты ручнічок, малым дзецям — стужкі. Калі мужчына пры жыцці курыў, яму часам нясуць папяросы. Таксама бяруць з сабой грамнічную свечку (яна на працягу года ўдзельнічае ва ўсіх важных сямейных абрадах і рытуалах) і салодкую ваду з журавінамі.

Прыйшоўшы на могілкі, звоняць у званіцу — так тут называюць маленькі звон з былой царквы, што ўсталяваны на вялікім дубе на могілках. Звонам «будзяць памерлую радню», а пасля абыходзяць пахаванні ўсіх родных, каля кожнай магілкі ліюць салодкую ваду і пакідаюць велікодныя прысмакі.

Пасля наведвання могілак збіраюцца ў хаце аднаго з прадстаўнікоў роду і працягваюць свята, успамінаючы тых, каго наведалі. Сядаюць за стол (у гэты дзень надзвычай багаты), яшчэ раз клічуць памерлых, гуляюць у біткі. Важны момант — падчас сумеснага баўлення часу трэба распавесці пра тых, чые магілы наведалі ў гэты дзень, дзецям, унукам. Каб памяць пра дзядоў перадавалася праз пакаленні.

На Успенне жыхары Раздзялавіч зноў ідуць на могілкі, але гэтым разам нясуць продкам гародніну, каб аддзячыць за тое, што дапамаглі вырасціць ураджай. Пры гэтым кажуць «вазьміце і вашу долю». Важна прачнуцца рана, дзеля рытуалу адзець чыстае адзенне. Галоўнай у дзеі становіцца гаспадыня дома, гэта яе «справаздача» перад продкамі за тое, што вырасціла за лета.

А на восеньскія Дзяды абавязкова да абеду адзін з прадстаўнікоў сям'і мусіць завітаць на могілкі, зазваніць у звон і загукаць: «Хадзіце на абед да нас, мы ўжо гатовы, а вы ляжыце». У гэты дзень на могілкі нічога не нясуць, заходзяць да родзічаў, каб паклікаць на абед, вячэру. На стол ставяць кашу, мёд, кісель, квас з грыбамі, цукеркі. Варта запаліць свечку. Збіраючыся класціся спаць, гаспадары на стале пакідаюць некаторыя стравы. Абавязкова наліваюць у місачку салодкую ваду і ў яе кладуць кавалкі хлеба, як тут кажуць, гатуюць «сыту».

Перад сном усіх памерлых яшчэ раз згадваюць уголас і кажуць: «Дапамажыце год перажыць, каб быў мірны, ураджайны, каб усе здаровыя былі…» Мясцовыя жыхары кажуць: калі не паклічаш Дзядоў на вячэру, яны будуць цэлы год сніцца і палохаць.

Але ці сапраўды палохаць? Мо проста яны будуць згадваць пра тое, што варта клапаціцца пра памяць, але разам з тым клапаціцца пра сябе? Бо ці можна баяцца тых, каго любіш? Хай яны ўжо і ў іншым свеце. Яны ж бачаць. Яны пра нас памятаюць. А мы — пра іх.

**Марына ВЕСЯЛУХА**

**Паважаныя чытачы, наступны нумар газеты выйдзе 17 мая.**

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар
Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
02.05.2019 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 1129

**Друкарня** Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 1666

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.